

ЯБЛЫЧНЫ СЫР ... З АНТОНАЎКІ

Сямейная газета

ШЛЮБ БЕЗ ВЯНЧАННЯ НЕ СЯМ'Я?

Сямейная газета




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 ЧЭРВЕНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 126 (29748)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Абноўлены закон аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве спросціць і паскорыць рэалізацыю інфраструктурных інвестпраектаў, надасць новы імпульс гэтаму інстытуту праз істотнае спрашчэнне працэдур. Сёння эканоміка мае патрэбу ў дадатковых крыніцах фінансавання інфраструктурных праектаў. Ва ўмовах адмовы міжнародных арганізацый ад выканання раней узятых на сябе абавязацельстваў неабходна максімальна задзейнічаць альтэрнатыўныя механізмы, якія ёсць у нас, за кошт прыцягнення сродкаў прыватных інвестараў. Тут мы ўлічылі пасяховы вопыт Расіі, Казахстана, Турцыі і іншых краін, якія дазволілі ў некаторых выпадках заключаць пагадненні аб ДПП без правядзення конкурсу. У нас пакуль прадугледжаны толькі адзін варыянт — правядзенне конкурсных працэдур. Ён з'яўляецца працаёмкім, затратным і не заўсёды апраўданы».*

# Аэрадром памяці



Жыхар Оршы, былы кіроўца аўтобуса Уладзімір СУХАДОЛЬСКІ, у памяць пра свайго бацьку лётчыка-франтавіка зрабіў копію самалёта У-2, якую выставіў каля свайго дома. Кожны, хто крочыць па завулку Крывому ў аршанскім Задняпроўі, бачыць легендарную крылатую машыну. З таго часу, як падворак умельца ператварыўся ў своеасаблівы аэрадром, сюды, як у музей, прыходзяць школьнікі, групы з дзіцячых садкоў — так хочацца ім убачыць і памацаць самалётны макет, пасядзець у кабіне пілота, адчуць сябе ў ролі лётчыка альбо стралка-радыста. Уладзімір не забараняе, наадварот, усяляк заахвочвае, маўляў, прыходзьце, глядзіце, гуляйце. Майстар перакананы, што прывіваць пачуццё патрыятызму трэба з дзяцінства, каб малыя аршанцы ведалі, якія цікавыя і майстравыя людзі жывуць побач і якія адмысловыя рэчы яны робяць уласнымі рукамі.

— Мой бацька Мікалай Андрэевіч — равеснік рэвалюцыі, перад вайной скончыў Віцебскі педагагічны інстытут, працаваў у школе настаўнікам чарчэння і малявання. На вайне быў ад самага пачатку і да сорак чацвёртага. Скончыў авіяшколу ў Куйбышаве, лятаў як разведчык на варожыя пазіцыі, удзельнічаў у баях пад Ельняй, на Кёнігсбергскім напрамку, — згадаў мой суразмоўнік. — А пасля вайны зноў быў на педагагічнай працы. Магчыма, ён ухваліў бы гэты мой праект, калі б быў жывы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

*Больш здымкаў з падворка Уладзіміра Сухадольскага глядзіце на сайце «Звязды».*

Ураджай-22

## ПРОБНЫ ВЫХАД

### У Брэсцкай вобласці прыступілі да жніва азімых культур

**Асобныя гаспадаркі Брэстчыны пачалі выбарачнае жніва азімых культур. Гэта рэдкі выпадак, калі камбайны выходзяць на палеткі ў чэрвені. Але такому становішчу паспрыяла сёлетняя спёка.**



Фота БелТА.

Ідзе ўборка ячменю ў ААТ «Астрамечава».

Першымі на зажынкі выйшлі ў паўднёвых раёнах вобласці: Брэсцкім, Камянецкім, Жабінкаўскім, Столінскім. Праз некалькі дзён колас паспрабуюць на сілу і ў суседніх раёнах. Першай культурай, якая ўбіраецца, традыцыйна становіцца азімы ячмень. Вільготнасць зерня цяпер складае ад 14 да 16 працэнтаў, гэта добры паказчык для ўборкі — паведамілі ў аблсельгасхарчы.

У Брэсцкім раёне першымі на ўборку выйшлі земляробы ААТ «Астрамечава». 29 чэрвеня быў пробны выхад, свайго кшталту агледзіны. Чатыры машыны ўбралі невялікае поле ячменю. Праз тры-чатыры дні да ўборкі далучацца іншыя экіпажы камбайнераў. Уборку завяршыць у гаспадарцы плануюць за два тыдні, пры ўмове, што надвор'е паспрыяе. Усяго ж на Брэстчыне сёлета трэба ўбраць 360 тысяч гектараў збожжавых і зернебабовых. Тэхніка і сушыльная гаспадка да ўборачнай кампаніі гатовы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Зварот у рэдакцыю

## ЭХ, ДАРОГІ...

### Калі да дома ў вёсцы не пад'ехаць — чый гэта клопат?

**Атрымаць доўгачаканы ўчастак зямлі пасля шматгадовага стаяння ў чарзе — гэта, пагадзіцеся, вялікае шчасце для кожнай сям'і. Здаецца, пабудаваў дом, жыві і радуйся. Але ў рэальнасці, на жаль, не заўсёды ўсё так весялкава. У прыватнасці, маладым сем'ям, якія звярнуліся ў рэдакцыю, у 2013 годзе райвыканкам выдзеліў участкі як маючым патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў на ўскрайку вёскі Арэшнікі Смалявіцкага раёна. Нарэзалі іх у полі, побач з лесам. На словах абяцалі, што ў найбліжэйшы час на новай вуліцы Маладзёжнай пабудуюць пад'язную дарогу. Але прайшло дзевяць гадоў, а яна так і не з'явілася...**



Участак дарогі, які жыхары вуліцы Маладзёжнай падсыпалі нядаўна сваімі сіламі.

СТАР. 15

### КОРАТКА

- Каля 40 % выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта размеркаваны ў Мінск, паведаміў рэктар БДМУ Сяргей Рубнікові́ч. Сёлета 944 студэнты БДМУ атрымаюць дыпломы аб заканчэнні ВНУ, з іх 733 беларускія выпускнікі і 211 іншаземцаў з больш як 50 краін. Беларусы з 1 жніўня прыступяць да работы на сваіх працоўных месцах.

ISSN 1990 — 763X

Парламенцкі дзённік

# БУДАЎНІЦТВА БЕЗ СУПЯРЭЧНАСЦЯЎ

## Цяпер грамадзяне змогуць атрымаць столькі зямлі, колькі ім неабходна

**На пасяджэнні восьмай сесіі Палаты прадстаўнікоў у другім чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні кодэксаў» (па пытаннях зямельных адносін і самавольнага будаўніцтва). У сувязі з гэтым Кодэкс аб зямлі будзе мець новую рэдакцыю.**

Прадугледжваецца, што рашэнне фундаментальных пытанняў, якія датычацца выкарыстання сельскагаспадарчых і лясных земляў, захоўваецца за Прэзідэнтам. Савет Міністраў надзяляецца кампетэнцыяй па ўстанаўленні парадкаў адабрання і вылучэння зямельных участкаў, пераводу земляў з адных катэгорый і відаў у іншыя. Астатнія пытанні, якія існуюць у грамадстве, будуць вырашацца на мясцовым узроўні згодна з існуючымі нормамі і новым заканадаўствам.

— Законапраект датычыцца кожнага чалавека, грамадзяніна, арганізацый — усіх, хто зацікаўлены працаваць на зямлі, будаваць, развіваць сваю дзяржаву, — адзначыў **старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Мікалай ШАЎЧУК**. — Можна будзе ўзаконіць усе супярэчнасці, якія меліся пры будаўніцтве, у тым ліку самавольным. Яны будуць вырашацца на ўзроўні мясцовых органаў улады, якія прымуць рашэнне на карысць грамадзяніна. Таксама можна будзе развіваць сельскагаспадарчыя арганізацыі, бізнес, фермерства, атрымаць зямлю без асаблівых праблем. Чалавек зможа атрымаць столькі зямлі, колькі яму неабходна. Прадугледжваецца магчымасць павелічэння ўчасткаў, якія раней вылучаліся для асабістай падсобнай гаспадаркі.

Адным словам, усе пытанні, якія ставіла жыццё, дэпутаты максімальна ўлічылі ў новым Кодэксе аб зямлі. З мэтай выключэння карупцыйных праяўленняў, а таксама эфектыўнага выкарыстання «залатых» земляў прыгарадных раёнаў Мінска і абласных цэнтраў па прапанове парламентарыяў устанаўліваецца патрабаванне аб унясенні землекарыстальнікам платы за зямельны ўчастак па яго рынкавым кошце, але які не будзе ніжэйшы за кадастравы. У выпадку, калі ўчастак раней быў выкуплены ў прыватную ўласнасць па кадастравым кошце, землекарыстальнік павінен будзе даплаціць розніцу паміж рынкавым і кадастравым коштам зямельнага ўчастка. Яшчэ адна з навацый дакумента — павялічаца памеры зямельных участкаў, якія вылучаюцца грамадзянам у сельскай мясцовасці.

Праектам закона таксама прапануецца новая рэдакцыя артыкула 223 Грамадзянскага кодэкса, які датычыцца самавольнага будаўніцтва. Пры ажыццяўленні самавольнага будаўніцтва ў канкрэтных выпадках прапануецца ўстанавіць абавязковую норму аб прыняцці мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, калі іншае не ўстаноўлена кіраўніком дзяржавы, рашэння аб лёсе аб'екта. У выпадку адмовы выконваць прынятае рашэнне будзе ажыццяўляцца знос аб'екта з кампенсацыяй прычыненай шкоды асобай, якая адмовілася.

Навацыі законапраекта дазволяць істотнай частцы насельніцтва рэалізаваць свае магчымасці па распараджэнні зямельнымі ўчасткамі, упарадкаваць аб'екты самавольнага будаўніцтва, будуць садзейнічаць развіццю сельскіх тэрыторый.

**Паводле БелТА.**

Па сутнасці



# На крылах незалежнасці

**Пільна ўглядаючыся ў сусветны небасхіл, ён марыў знайсці сваю зорку. Шчаслівую зорку, пад якой бы будаваў сам сваё жыццё. Але заміналі сквапныя чужынцы. Якое ўглядацца ў неба? Ці мог той руплівы чалавек нават вочы падняць, разагнуць спіну ад працы? Не, варта дбаць аб хлебе надзённым, аб дабрабыце дзяцей — тое зразумела. Тое — святое. Але галеча і нястача сталаваліся ў яго хаце. Карацей, не да песень было. Зімой хаўтуры спраўляла завіруха, нават летам пад промнямі пякучага сонейка на палетках чулася песня жальбы.**

Жальба была ўбіта ў яго цела і душу панскай пугай. Нездарма адзін з першых зборнікаў Песняра, які задаў яму і сабе пытанне «А хто там ідзе?», — «Песні жальбы». Яго ніколі не запрашалі ў светлыя пакоі, што стаялі на падмурку яго крывавай працы. Толькі цівуны і маглі запрасіць на панскі двор. І не для красы. Узоры малявалі на спіне — лупцавалі. Нават зямля пад нагамі ў хаце без падлогі была не яго...

Ён быў вымушаны апошнія капейкі аддаваць на вучобу сваіх дзяцей грамаце. І толькі мог сабе дазволіць раскашэліцца на «дарэктара». Чужынцам не патрэбны адукаваны народ... Але з непралазнай Пушчы, з непраходнай палескай дрыгвы, з крутых берагоў Дняпра, з няўрымслівых хваляў Нёмана, з прыземістых хат з саламянымі дахамі, нібыта вялікая птушка, расправіў крылы народ, які не ведаў нават сваё імя. Альбо забыўся. У польскіх школах яму не расказвалі ні пра Гусоўскага, ні пра Скарыну, ні пра Ефрасінню Полацкую. Патрэбны быў народ халопаў. І зараз праз «Тэлеграм» усім неверагодным прапануюць — плантацыі. Хацелі перамен як у Еўропе. Атрымалі. Не хацелі ўцяміць філасофію фільма «Ідзі і глядзі». Ідзі і працуй. Вось яны — апазіцыянеры — танныя працаўнікі. Вось як цікава атрымліваецца пад лозунгам «разбурыць муры». Польшча будуе сцяну непаразумення, знішчаючы прыроднае хараство, а вулічныя спевакі накінулі на сябе путы. Спявайце. Песні жальбы. Усё, як і раней: ведайце, халопы, сваё месца.

Прабачце, апошлю параўнальны рад. Назавіце мне беларуса, які пры Польшчы альбо «вызваліцелях Еўропы» — нацыстах мог стаць міністрам замежных спраў ці нобелеўскім лаўрэатам. Толькі лёс здрадніка Кушаля — вось пік кар'еры, на які дазволена было б узняцца выхадцам з нашых зямель.

А яшчэ шмат талентаў было скрадзена чужынцамі. Бо тады і назвы такой не было. І паняцця «незалежнасць» не існавала. Не існавала на паперы. Але ў душах нашага народа, нібы тая кветка-папараць, расцвітала прага той самай НЕЗАЛЕЖНАСЦІ. Набірала сілу і вырвалася на шырокі прастор. Народ заплаціў цягам стагоддзяў вялізную цану за гэта, а самую вялікую і страшную — кожнага трэцяга — зусім нядаўна...

Народ, якому наканавана было з цагляных сутарэнняў дэфензівы і гестапа ўзняцца да заснавальніка ААН. Цяжка было нам шлях прайсці да Беларусі. Але мы дайшлі. Рукамі беларуса Грамыкі падпісвалі лёсавызначальныя для ўсяго свету дэкларацыі. А вачыма беларуса Клімука ўбачылі з вышыні нашу зямлю. Зямлю, аб якой заўжды марыў дбайны і руплівы гаспадар. Той жа коласаўскі Міхал.

Колькі разоў нашу зямлю перательвалі ў цераспалосіцу... Падабаецца камусьці ці не, але факт застаецца фактам. Менавіта пры Лукашэнку мы змаглі заняць «свой пачэсны пасаг між народамі». Заявілі аб сабе на ўвесь свет.

Беларуская мова, нібы нашы даляглядны, сціплая і прыгожая. Блізкасць да прыроднага хараства перадаецца ў яе словах. Як прыгожа гучыць — «знічка». Зорка, якая знікае... Вось там самая яркая зорка Венера, што ўзышла над нашай зямлёй, і ёсць НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ. Але не перательвайце яе ў знічку.

Аб ёй марылі паэты-летуценнікі Максімы, спрабавалі знайсці гістарычныя і юрыдычныя высновы Францыскі, адстойвалі ў руках са зброяй дружыны пад Грунвальдам і народныя палкі пад Суражам, партызанскія атрады ў «рэйкавай вайне». Незалежнасць будавалі дойліды Каложы і Камянецкай вежы, увасаблялі ў Крыжы Ефрасінні Полацкай і Брэсцкім Евангеллі. Яе гарантуюць хлопцы з АСАМа, знаходзячыся ў сакрэтах, і камбайнеры ў гарачую пару жніва, вучоныя, схіліўшыся над сваім вынаходніцтвам, і хірургі над аперацыйным сталом. Гэта мы ўсё маем. Усе мы старанна выводзім «НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ». І добра, што ёсць чалавек, які правільна паставіў націск у гэтым святым слове. Усім бы нам так навучыцца...

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

Камунальныя стасункі

# Прынцып росту тарыфаў за «камуналку» зменіцца?

**Планавае штогадовае павелічэнне кошту платы за жыллёва-камунальныя паслугі ў межах пяці долараў, магчыма, можа быць заменена іншай лічбай, якую прывяжуць да велічыні базавай стаўкі. Такое меркаванне выказаў міністр ЖКГ Андрэй ХМЕЛЬ падчас пасяджэння Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Палаты прадстаўнікоў, паведамляе БелТА.**



Паколькі ў Беларусі існуе інфляцыя, рост цэн, заробку і кошту энерганосьбітаў, а таксама праходзіць дэдаларызацыя эканомікі, міністр не выключае, што зменіцца і падыход да павелічэння тарыфаў на паслугі ЖКГ. Андрэй Хмель падкрэсліў, што рост тарыфаў не павінен будзе біць па кішэні чалавека, а цяперашні іх узровень трымаецца дзякуючы палітыцы кіраўніка дзяржавы:

— Ільвіная доля затрат на цеплазабеспячэнне і падагрэў вады прыходзіцца на энерганосьбіты, і канкурэнтная цана на газ і іншыя энергарэсурсы дазваляе і дазволіць і надалей стрымліваць рост тарыфаў.

Расход бюджэту сям'і з двума працоўнымі (з сярэднім заробкам у сярэдняй кватэры) на жыллёва-камунальныя паслугі не павінен перавышаць 5 %, і так павінна застацца, дадаў ён.

Падчас пасяджэння дэпутаты абмеркавалі іншыя актуальныя пытанні функцыянавання ЖКГ, накшталт кіравання агульнай маёмасцю дома, капрамонту і доступу падчас яго правядзення ў жыллё грамадзян, а таксама ўтрымання прыдомавых тэрыторый, бездар'ернага асяроддзя і іншыя моманты работы жыллёва-камунальнай галіны краіны.

**Ірына СІДАРОК.**

## ЗАМКНУЛА Ў КВАТЭРЫ КУР'ЕРА

**Пажылой мінчанцы паступіў званок ад сына, які нібыта трапіў у ДТЗ. Схема стандартная: для вызвалення ад адказнасці неабходна 20 тысяч долараў.**

Як паведамляе падраздзяленне ГУУС Мінгарвыканкама, праз некаторы час да пенсіянеркі па грошы прыехаў кур'ер, якога, западозрыўшы нядобрае, пацярпелая замкнула ў кватэры і выклікала міліцыю.

Праваахоўнікі неадкладна выбылі на месца здарэння і затрымалі кур'ера на месцы злачынства. Са слоў затрыманага, прапанову аб дадатковым заробку ён знайшоў у тэлеграм-канале, дзе яму даслалі адрас «атрымання пасылкі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец), в лице антикризисного управляющего в деле о банкротстве Колеснёва Н. М., извещает о проведении 27 июля 2022 года открытого повторного аукциона со снижением начальной цены на 25 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб. | Шаг аукциона – 5 %, бел. руб. | Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Условие продажи:** 1) Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. 2) В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 % | | | | |
| 1 | **Легковой автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT**, 2008 года выпуска, рег. знак **1088 АА-3**, идентификационный номер (номер кузова, рамы) WVWZZZ3CZ9P016090, находящийся по адресу: г. Гомель, ул. Малайчука, 12. **Сварочный генератор EW 220 DC**, инв. № 5503, находящийся по адресу: г. Чечерск, ул. Советская, 42 | **11 017,50** | 550,88 | 1 101,75 |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблстрой», г. Гомель, ул. Малайчука,12. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (029) 185-37-18 – управляющий в деле о банкротстве Колеснев Николай Михайлович; 8 (044)769-19-61, 8 (0232)53-27-62 – по недвижимости Яроцкая Людмила Николаевна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1)** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельоблстрой»)**: р/с BY73 BLBB 3012 0400 0516 9300 1001, в Головной ф-л по Гомельской области ОАО «Белинвестбанк», БИК BLBBBY2X, УНП 400051693, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2)** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 30 июня 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 25 июля 2022 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за **5 (пять) дней** до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником** (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, **увеличенной на 5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента его подписания и возместить затраты и расходы на организацию и проведение аукциона, в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части) и с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. От 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» Ст. 127-129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 06.04.2022 № 66 (29688). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by, www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

Даследаванне

# «КРАІНА, У ЯКОЙ Я ЖЫВУ»

**Інстытутам сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук праведзена новае сацыялагічнае даследаванне «Патрыятычныя каштоўнасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Яго вынікі ў Нацыянальным прэс-цэнтры прэзентаваў малодшы навуковы супрацоўнік аддзела сацыялогіі і культуры Мікіта БРАЎЧУК.**



«Адно з пытанняў прапаноўвала рэспандэнтам завяршыць сказ «Для мяне Беларусь — гэта...». Было некалькі варыянтаў адказаў, якія дазвалялі прааналізаваць тыя асацыяцыі, якія ў свядомасці насельніцтва звязаны з нашай краінай. Як паказваюць даныя, 64,8 працэнта ўспрымаюць Беларусь як краіну, у якой яны нарадзіліся. Мы адзначылі, што гэты адказ найболей распаўсюджаны сярод рэспандэнтаў усіх узроставых груп. На другім месцы быў адказ: «Для мяне Беларусь — гэта краіна, у якой я жыву». Трэці па папулярнасці адказ гаворыць аб тым, што для часткі апытаных Беларусь з'яўляецца зямлёй іх продкаў», — распавёў Мікіта Браўчук.

На пытанне, ці ганарацца рэспандэнты тым, што яны з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі, былі атрыманы наступныя адказы. Пераважная большасць апытаных, 78,3 %, ганарацца тым, што з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі. Яшчэ 12, 6 % адказалі, што хутчэй ганарацца. Такім чынам, доля рэспандэнтаў, якія станоўча адказалі на гэтае пытанне, склала 90,9 працэнта. Найбольш высокая ўдзельная вага тых, хто падзяляе такую пазіцыю, назіраецца сярод моладзі — 96,9 працэнта. Акрамя таго, высокі працэнт рэспандэнтаў, якія далі станоўчы адказ, назіраецца ў самай узроставай групе ад 55 гадоў і старэйшых».

Трэцяе пытанне было сфармулявана наступным чынам: што для рэспандэнтаў значыць быць грамадзянамі Беларусі? «У гэтым даследаванні мы паспрабавалі высветліць, які сэнс рэспандэнты ўкладаюць у сутнасць грамадзянства Беларусі. Гэта адзін з найбольш важных аспектаў патрыятычнай асновы беларускага грамадства. Найбольш распаўсюджаным меркаваннем з'яўляецца неабходнасць прытрымлівацца законаў нашай краіны. Доля рэспандэнтаў, якія выбралі гэты варыянт адказу, складае 44,4 %. Для 27,6 % апытаных быць грамадзянінам Беларусі азначае мець афіцыйнае беларускае грамадзянства. Трэцім па папулярнасці адказам з'яўляецца наяўнасць актыўнай грамадзянскай пазіцыі», — адзначыў малодшы навуковы супрацоўнік.

Яшчэ адно пытанне было заклікана вывучыць успрыманне патрыятызму ў беларусаў. «55,9 % адказалі, што ўпэўнена адносяць сябе да патрыётаў Беларусі. Хутчэй лічаць сябе патрыётамі 30,6 %. Мы адзначылі наступную тэндэнцыю: чым старэйшы рэспандэнт, тым з большай доляй верагоднасці ён адкажа станоўча», — рэзюмаваў Мікіта Браўчук.

На слыху

# «ПАЎСТАЕ ШЭРАГ РЫЗЫК»

## Мінфін растлумачыў, чаму Беларусь вырашыла праводзіць выплаты па еўрабондах у нацвалюце

**Міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ растлумачыў прычыны рашэння, згодна з якім Беларусь будзе выконваць даўгавыя абавязацельствы па еўрааблігацыях у беларускіх рублях, паведаміла БелТА.**

«Частку сваіх абавязацельстваў мы ўжо выконваем у беларускіх рублях па рашэнні ўрада і Нацбанка. Пералічваем грошы на рахунак, і тыя нашы партнёры, хто хоча, могуць звяртацца і забіраць гэтыя рэсурсы. Цяпер прынята пастанова, куды таксама ўключаны лонданскі Сіцібанк як наш агент па еўрааблігацыях», — сказаў Юрый Селівёрстаў.

Міністр растлумачыў, чым абумоўлена гэта рашэнне. Так, апошняя выплата працэнтнага даходу па еўрааблігацыях Беларусі была напярэдадні лютага. Тады Міністэрства фінансаў пералічыла ў поўным аб'ёме суму ў долярах ЗША на карысць плацежнага агента — Сіцібанка. Банк павінен залічыць гэтыя грошы на карысць міжнародных клірынгавых сістэм, тыя па ланцужку — на карысць трымальнікаў. Аднак у Мінфін пачалі паступаць шматлікія звароты ўладальнікаў каштоўных папер аб неатрыманні альбо атрыманні ў няпоўным аб'ёме належных выплат. «Гэта інвестары з Беларусі, Расіі і, можа, нехта яшчэ, таму што канечны інвестар нам невядомы: з імі працуюць адпаведныя плацежныя агенты — банкі і дэпазітарныя сістэмы», — дадаў кіраўнік ведамства.

Міністэрства фінансаў зрабіла спробы высветліць прычыны недаатрымання ўладальнікамі сродкаў. «На пытанне, чаму да інвестараў не даходзяць грошы, у нас ёсць афіцыйны адказ ад банка, што ўсё пералічана, звяртайцеся ў дэпазітарныя сістэмы. А ў гэтых сістэмах сказалі, што не будуць весці з намі дыялог па гэтай тэме, маўляў, разбіраецеся з плацежным агентам. Па ўсёй сітуацыі мы бачым, што гэтыя сістэмы імкнуцца не даводзіць плацяжы да тых, хто, з іх пункту гледжання, з'яўляецца санкцыйным — па сутнасці, гэта тыя, хто абслугоўваўся ў расійскіх дэпазітарыях, гэта беларускія банкі», — адзначыў Юрый Селівёрстаў. Больш за тое, міжнародныя клірынгавыя сістэмы ўносяць змяненні ў свае дакументы і рэгламенты, вызваляючы сябе ад любой адказнасці з адсылкай на санкцыйныя абмежаванні.

Міністр падкрэсліў, што ў гэтай сітуацыі паўстае шэраг рызык. «Папершае, верагодна, што значная частка грошай не дойдзе да дружалюбных інвестараў — паводле нашых ацэнак, каля 40 працэнтаў. Яны проста будуць недзе заблакаваны. І другі момант — мы плацім праз Нацбанк, а на яго ўведзены абмежаванні. Таму ёсць рызыка, што наогул уся сума плацяжу не дойдзе. У гэтых умовах, на жаль, ажыццяўляць стандартныя разлікі па еўрааблігацыях становіцца бессэнсоўна. Для чаго гэта рабіць, калі мы не ведаем канчатковага выніку?» — задаў пытанне Юрый Селівёрстаў.

Ведай нашых!

# НАЙЛЕПШЫЯ Ў ПРАСТОРЫ СНД

## Кніга Выдавецкага дома «Звязда» атрымала высокую ўзнагароду

**У Бішкеку (Кыргызстан) падведзены вынікі XIX Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**




8 краін — Азербайджан, Арменія, Беларусь, Казахстан, Кыргызстан, Расія, Узбекістан, Таджыкістан — прадставілі 77 найлепшых, на іх пункт гледжання, выданняў. Спаборніцтва ішло ў наступных намінацыях: «Садружнасць», «Мая Краіна», «Дыялог Культур», «Кніга для дзяцей і юнацтва», «Навука і адукацыя», «Арт-кніга», «Мастацтва ілюстрацыі», «Надрукавана ў Садружнасці», «Перамога», «Гран-пры».

У намінацыі «Гран-пры» перамогу атрымала выданне «Гераічны эпас кіргізаў «Манас» (у 3-х кнігах; з малюнкамі), якое пабачыла свет у Кыргызстане.

Па выніках галасавання кампетэнтнага журы ў кожнай з намінацый прызавыя месцы занялі і кнігі беларускіх выдавецтваў. У намінацыі «Садружнасць» першае месца — у кнігі «Подзвіг савецкага народа бессмяротны... Новыя экспазіцыі музеяў «Брэсцкая крэпасць-герой» і Перамогі на Паклоннай гары ў Маскве», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда» пры падтрымцы Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Сярод кніг-пераможцаў з беларускага боку — найлепшыя выданні «Беларускай навукі», «Гродна Плюс», «Народнай асветы», «Вышэйшай школы», «Беларусі», «Гродненской правды».

**Сяргей ШЫЧКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Байдэн абмовіўся і назваў НАТА пагрозай

Прэзідэнт ЗША Джо Байдэн падчас перагавораў з прэм'ер-міністрам Іспаніі Пэдра Санчэсам дапусціў агаворку і назваў НАТА пагрозай самому сабе, паведамляюць РІА «Навіны».

«Сутнасць у тым, што альянс пагражае нашым пазіцыям», — сказаў ён. Аднак пасля гэтага амерыканскі лідар адразу ж паправіў сябе, адзначыўшы, што альянс разам «змагаецца з пагрозамі і ўзмацняе свае пазіцыі супраць пагроз з Усходу і выпрабаванняў з Поўдня».

Адзначаецца, што Байдэн даволі часта робіць такія агаворкі.

## У Расіі заявілі аб вяртанні заходніх кампаній праз трэцяя краіны

Віцэ-прэзідэнт Расійскага саюза прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Сяргей Красільнікаў заявіў, што некаторыя заходнія кампаніі пасля свайго сыходу з расійскага рынку вяртаюцца назад у Расію праз трэцяя краіны.

Паводле яго слоў, пацвердзіць або абвергнуць інфармацыю заходніх СМІ аб адной тысячы фірм, якія пакінулі Расію, складана. «Магу толькі сказаць, што, па даных ЦБ, да нядаўняга часу ў краіне працавала каля 30 тысяч замежных кампаній. Справа ў тым, што ніякай афіцыйнай статыстыкі адносна сыходу кампаній з Расіі ні ў кога няма, ды і быць не можа. Бо форма ўдзелу ў кожнай з іх розная», — сказаў Красільнікаў.

Паводле яго слоў, пры сыходзе кампаніі з Расіі ў краіне могуць застацца субпадрадчыкі або «дочкі». Акрамя таго, некаторыя кампаніі пакідаюць РФ, «але тут жа вяртаюцца праз іншыя краіны». Ён таксама дадаў, што да сур'ёзных наступстваў прывёў сыход толькі тых кампаній, у якіх у Расіі была свая вытворчасць. Напрыклад, як у IKEA ці Renault, бо на гэтых прадпрыемствах працавалі дзясяткі тысяч людзей.

## Спякота ў Японіі стала рэкорднай за 150 гадоў



У Японіі зафіксавана рэкордная за амаль 150 гадоў спякота, паведамляе BBC.

У Токіа пяты дзень запар тэмпература паветра перавышае 35 градусаў цяпла. А ў горадзе Ісасакі зафіксаваны рэкордны плюс 40,2 градуса. Гэта самая высокая тэмпература, якая калі-небудзь была зарэгістраваная ў чэрвені на тэрыторыі краіны. Метэаролагі папярэджваюць, што найбліжэйшымі днямі высокая тэмпература захаваецца.

Адзначаецца, што чэрвень у Японіі лічыцца сезонам дажджоў, але ў пачатку гэтага тыдня Японскае метэаралагічнае агенцтва аб'явіла аб яго заканчэнні, што адбылося на 22 дні раней, чым звычайна.

Акрамя таго, афіцыйныя асобы папярэдзілі аб магчымым недахопе электраэнергіі з-за спякоты і заклікалі насельніцтва скарачаць спажыванне энергіі. Аднак паранейшаму было рэкамендавана выкарыстоўваць кандыцыянеры. Нягледзячы на тое, што пастаўшчыкі электраэнергіі працуюць над павелічэннем паставак, сітуацыя застаецца непрадказальнай.


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 28 июля 2022 года проводит 15-й открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности**

| Номер лота | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 171 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 109 на ЗиЛ–130, ш. 2245867, дв.153934, 1984 г., 4 кат., 1086 км, 25,8 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 13 500,00 | 2 700,00 |
| 172 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 109 на ЗиЛ–130, ш. 1993373, дв. 653929, 1982 г., 4 кат., 1875 км, 5,5 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 13 500,00 | 2 700,00 |
| 173 | Перекачивающая станция горючего ПСГ-160 (130) скл. с/о 36 на ЗиЛ–130, ш. 1848582, дв. 352120, 1981 г., 4 кат., 1112 км, 3234 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 13 000,00 | 2 600,00 |
| 174 | Автоцистерна АЦ-8-5334 с/о А8320315 на МАЗ-5334, ш. 47511, дв. 628805, 1983 г., 4 кат., 38646 км, 44,5 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 23 100,00 | 4 620,00 |
| 175 | ТЗА-7,5-5334 (топливозаправщик авиац.) с/о А8331032 на МАЗ-5334, ш. 53255, дв. 648474, 1983 г., 4 кат., 25317 км, 952,3 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 20 000,00 | 4 000,00 |
| 176 | Автоцистерна АЦ-7-4310 с/о 8708021 на КАМАЗ-4310, ш. 0032730, дв. 694105, 1987 г., 4 кат., 54559 км, 404 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 25 000,00 | 5 000,00 |
| 177 | Топливозаправщик ТЗ-8-255БМ с/о А841103 на КрАЗ-255Б1, ш. 492609, дв. 864104, 1984 г., 4 кат., 16569 км, 164,6 м/ч | н. п.Михановичи в/ч 52188 | 19 000,00 | 3 800,00 |
| 178 | Автомобиль ГАЗ-66-14 с кузовом-фургоном К-66Н в составе: автошасси ГАЗ-66-14, ш. 0477452, дв. 205079, 1986 г., 4 кат., 2000 км; кузов-фургон К-66Н (модификация К-66) № 09887, 1986 г., 4 кат. | г. Береза в/ч 23324 | 4 600,00 | 920,00 |
| 179 | Грузовой бортовой ЗиЛ-131, ш. 381288, дв. 083076, 1980 г., 4 кат., 2666 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 7 000,00 | 1 400,00 |
| 180 | Автошасси ЗиЛ-431412, ш. М3120716, дв. 788739, 1991 г., 4 кат., 982 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 5 000,00 | 1 000,00 |
| 181 | Грузовой бортовой Урал-432000-01, ш. М0167230, дв. 735394, 1991 г., 4 кат., 40450 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 15 500,00 | 3 100,00 |
| 182 | Грузовой бортовой Урал-432000-02, ш. М0181951, дв. 836487, 1991 г., 4 кат., 21871 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 16 000,00 | 3 200,00 |
| 183 | Грузовой бортовой Урал-43202, ш. 032791, дв. 652367, 1984 г., 4 кат., 51944 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 15 000,00 | 3 000,00 |
| 184 | Грузовой бортовой Урал-432020-01, ш. XIP432020M0170052, дв. 757067, 1991 г., 4 кат., 98831 км | г. Старые Дороги в/ч 48668 | 14 500,00 | 2 900,00 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж, 28 июля 2022 г. в 10.00.

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток, гарантийный депозит и подавшие заявление на участие в аукционе, соглашение, учредительные и другие необходимые документы **до 15.00 25 июля 2022 года**. Заключительная регистрация участников аукциона будет производиться 28 июля 2022 г. с 9.15 до 10.00.

Победитель аукциона обязан:

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3 банковских дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение 5 банковских дней для резидентов Республики Беларусь и 10 банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, указанный в таблице, а также гарантийный депозит в размере 300,00 белорусских рублей за участие по каждому лоту и денежные средства за выигранное имущество перечисляются на расчетный счет РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»: белорусские рубли – р/с BY12BELB30120002R20010226000, российские рубли – р/с BY64BELB30120002R20040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», ул. Заславская, 10, код BELBBY2X, УНП 101099370, ОКПО 37401662. Корреспондент – ПАО Сбербанк, г. Москва, № корсчета 30101810400000000225. Реквизиты банка: БИК 044525225 ИНН 7707083893, к/с в ОАО «Банк БелВЭБ» №30111810800000000659. SWIFT/BIC: SABRRUMM. Без НДС.

Справки по тел/факс: (017)319-35-41, (017)367-58-05. Электронная почта: auk@bsk.by.

Извещение опубликовано на сайте http://www.gki.gov.by/ru/ и https://bsk.by.

# ГІПЕРІНФЛЯЦЫЯ, ГАЛЛЁ І «ТУАЛЕТНАЕ МОРА»

## Што чакае палякаў?



**Улады Польшчы прагназуюць далейшы рост інфляцыі. Аб гэтым днямі заявіў Польскаму радыё прэс-сакратар урада Пётр Мюлер, паведаміла ТАСС. «Мы не хаваем, што чакаем росту інфляцыі, пакольKі сітуацыя на паліўным і энергетычным рынках паказвае на тое, што гэта будзе прыкметна», — сказаў чыноўнік. Чакаецца, што заўтра галоўнае статыстычнае ўпраўленне (ГСУ) Польшчы апублікуе сваю штомесячную справаздачу аб эканамічным становішчы краіны. Шэраг незалежных экспертаў лічаць, што ГСУ паведаміць у ім аб рэкорднай інфляцыі ў 15 працэнтаў у чэрвені. Як вядома, у маі гэты паказчык склаў 13,9 працэнта. Паводле экспертных прагнозаў, інфляцыйны пік у краіне будзе дасягнуты ў жніўні—верасні з паказчыкам у 15,5—16 працэнтаў. Улічваючы дзеянні афіцыйнай Варшавы, далей аналітыкі нават не заглядваюць. Што ж чакае палякаў?**

### БУДЗЕ ГОРШ

Хлеб у Польшчы падаражэў за апошнія 12 месяцаў больш чым на чвэрць (на 25,6 працэнта), што звязана з павелічэннем кошту інгрэдыентаў, з якіх яго вырабляюць, а таксама ростам цэн на энергарэсурсы, паведаміла выданне Rzeczpospolita. Эксперты мяркуюць, што да канца года цана на хлеб можа дасягнуць 30 злотых (каля 6,37 еўра). Прэзідэнт хлебапякарнай асацыяцыі Польшчы адзначыў, што кошт павялічваецца з пачатку года, таму што даражэюць збожжа і мука. Цана мукі павялічылася на 34 працэнты ў параўнанні з мінулым годам. Таксама даражэе ўсё, што трэба для вырабу хлеба: энергія, паліва, заробак.

Хлебапякарныя кампаніі ў паніцы, бо ўжо атрымалі папярэджанні ад пастаўшчыкоў энергіі аб магчымых перабоях у падачы электраэнергіі. Акрамя таго, што выкарыстоўваецца дарагая і маладаступная сыравіна, высокія цэны на паліва і энергію, яны могуць сутыкнуцца з рызыкай парушэння тэхналагічнага працэсу, што прывядзе да скарачэння вытворчасці і далейшага павелічэння кошту, паскардзіліся ўладальнікі пякарняў.

Тым часам усё больш польскіх спажыўцоў з-за інфляцыі пачалі ўстрымлівацца ад буйных выдаткаў, такіх як набыццё мэблі, электронікі і бытавой тэхнікі, паведаміла Rzeczpospolita. Адзначаецца, што змрочныя ў апошнія некалькі месяцаў настроі польскіх спажыўцоў у чэрвені яшчэ больш пагоршыліся. Паводле даных апытання галоўнага статыстычнага ўпраўлення Польшчы, 61 працэнт польскіх хатніх гаспадарак мяркуюць, што іх фінансавае становішча пагоршыцца ў найбліжэйшыя 12 месяцаў, і толькі 6 працэнтаў спадзяюцца на магчымае паляпшэнне. Акрамя таго, усё больш хатніх гаспадарак чакаюць росту беспрацоўя.

Прагназаванае пагаршэнне фінансавага стану спажыўцоў стала вынікам зніжэння пакупніцкай здольнасці, у сувязі з чым чакаецца спад спажывання напрыканцы года. Яшчэ горш палякі ацэньваюць перспектывы эканомікі краіны ў цэлым. Амаль 77 працэнтаў рэспандэнтаў не выключаюць пагаршэння эканамічнай сітуацыі на працягу года.

### КАДРАВЫ ГОЛАД

Змрочныя настроі людзей падтрымліваюць прагнозы эканамістаў. У найбліжэйшыя месяцы Польшча будзе перажываць далейшы рост цэн, эканоміка краіны будзе запавольвацца — да такой высновы прыйшлі эксперты Польскага эканамічнага інстытута (PIE). Аб гэтым паведаміў інфармацыйны партал польскага радыё RMF 24. Паводле даных PIE, сёлета ВУП Польшчы павялічыцца на 4,8 працэнта, у асноўным за кошт вытворчай дзейнасці і дадатковага попыту, што ствараецца бежанцамі. Аднак эканоміка будзе паступова запавольвацца. У 2023 го-дзе рост будзе вагацца ў межах 2,4—3,6 працэнта. Такая сітуацыя звязана з ростам цэн на сыравіну, дэфіцытам тавараў, аслабленнем экспарту і спадам прыватных інвестыцый.

Сярэдні ўзровень інфляцыі сёлета складзе ў Польшчы 13,1 працэнта, пры гэтым пікавыя значэнні ў памеры ад 15,8 працэнта чакаюцца ў жніўні. Паводле прагнозаў аналітыкаў, відавочнага зніжэння інфляцыі не адбудзецца да 2024 года. На думку экспертаў, гэта будзе самай вялікай эканамічнай праблемай у найбліжэйшыя два гады. Асноўнай крыніцай інфляцыі застаецца рост цэн на прадукты харчавання і энерганосьбіты.

Яшчэ адной праблемай для польскай эканомікі можа стаць недахоп рабочай сілы. Эксперты адзначаюць, што бежанцы з Украіны могуць толькі часткова кампенсаваць дэфіцыт на рынку працы, бо з Украіны прыязджаюць у асноўным жанчыны і дзеці да 18 гадоў. Некаторыя з іх знойдуць работу ў сферы гандлю і паслуг. Пры гэтым па-ранейшаму будзе адчувацца недахоп рабочых рук у большасці галін прамысловасці, будаўніцтва і транспарту.

Ужо цяпер польскія фермеры сутыкнуліся з недахопам рабочай сілы, з-за чаго на палях гніе ўраджай ягад і сітуацыя пагаршаецца штодня. Пра гэта распавёў кіраўнік Асацыяцыі польскіх садаводаў Міраслаў Малішэўскі ў радыёэфіры Radioplus. Ён адзначыў, што ў сельскай мясцовасці не хапае мужчын, якія маглі б выконваць цяжкую работу, напрыклад, кіраваць трактарам, грузавіком або раскідваць угнаенні, а таксама жанчын, якія займаліся б зборам ураджаю ягад, агародніны і садавіны.

Як заўважыў Міраслаў Малішэўскі, спажыўцы скардзяцца на занадта высокі кошт агародніны ды садавіны. На жаль, як адзначыў ён, вытворцы вымушаны павышаць цэны на сваю прадукцыю, таму што іх расходы на паліва, угнаенні і хімічныя сродкі аховы раслін узраслі ў некалькі разоў, і пры гэтым яны ўсё роўна не могуць кампенсаваць свае вытворчыя затраты.

Таксама стала вядома, што польскія настаўнікі пачалі масава звальняцца з-за нізкіх заробкаў, што прывяло да кадравага голаду ў сферы адукацыі ў краіне, паведаміла Rzeczpospolita. Паводле звестак выдання, зараз у школах не хапае каля 13 тысяч настаўнікаў. Пры гэтым звальняюцца нават настаўнікі з вялікім досведам працы.

Дырэктары школ (многія з якіх таксама звальняюцца) скардзяцца, што маладыя спецыялісты не хочуць працаваць у сферы адукацыі. А тыя, хто ўсё ж прыходзіць уладкоўвацца, расчароўваюцца, даведаўшыся пра зарплату. Адзначаецца, што настаўнікі, якія пачынаюць працаваць па прафесіі, зараз зарабляюць на ўзроўні некваліфікаваных работнікаў. Акрамя таго, нядаўна паведаміў аб сваім сыходзе з работы ў дзяржаўнай школе Дарыуш Мартыновіч, які летась атрымаў званне «Настаўнік года».



### МІЛЬЁНЫ МОГУЦЬ ЗАМЕРЗНУЦЬ

Мэр Познані Яцэк Ясковяк прызнаўся ў радыёэфіры: цэны на газ у пятым па колькасці насельніцтва польскім горадзе выраслі на 200 працэнтаў, і мегаполісу не хапае каля пяці мільёнаў тон вугалю. У прамым эфіры польскай радыёстанцыі RMF FM кіраўнік горада літаральна пасыпаў галаву попелам, прагназуючы да будучай зімы калапс у горадзе. «У асеннезімовы перыяд могуць узнікнуць праблемы з цеплазабеспячэннем. Нам пагражаюць адключэнні, — лічыць мэр Познані. — Наступны год будзе вельмі цяжкі не толькі ў плане росту цэн на энерганосьбіты, але і на прадукты харчавання». Паводле яго слоў, каб хоць неяк скарацiць затраты, муніцыпалітэт будзе вымушаны адмаўляцца ад шэрагу артыкулаў расходаў.

Экс-міністр эканомікі Польшчы і былы прэзідэнт энергетычнай кампаніі PGNiG Пётр Вазняк раскрытыкаваў новую цану на вугаль, якая рэзка ўзрасла. На думку палітыка, «гэта забойства палякаў» і «катастрофа». У інтэрв'ю радыёстанцыі RMF FM Вазняк заявіў, што ў Польшчы дастаткова радовішчаў вугалю для задавальнення ўласных энергетычных запатрабаванняў, аднак замест распрацоўкі радовішчаў урад падымае кошт вугалю. Ён удакладніў, што падобная цана вышэйшая за 10 працэнтаў ад даходу сярэднестатыстычнага паляка, што гаворыць аб гаротным становішчы грамадзян. «У цывілізаваных краінах ЕС, такіх як Вялікабрытанія і Францыя, калі 10 працэнтаў грошай вашай сям'і выдаткоўваецца на ацяпленне, то такая сям'я кваліфікуецца як энергетычна бедная і падлягае падтрымцы», — адзначыў экс-міністр, дадаўшы, што ў польскай прававой сістэме няма нават такога тэрміна — «энергетычная падтрымка».

Між тым урад заклікае людзей не панікаваць і купляць вугаль пра запас. Кіраўнік Міністэрства клімату і навакольнага асяроддзя Ганна Масква запэўніла, што польскія грамадзяне не замерзнуць зімой. Кіраўнік руху Сілезска-дамброўскай салідарнасці Дамінік Калож не згодны з урадам і сцвярджае, што вугалю гэтай зімой не будзе. Сваю пазіцыю ён аргументуе тым, што значна павялічыць здабычу гэтай сыравіны на польскіх шахтах да пачатку ацяпляльнага сезона немагчыма, а вугаль, які будзе экспартаваны, непрыдатны для ацяплення прыватных дамоў.

Нядаўна намеснік міністра дзяржаўных актываў Пётр Пызік прызнаў, што для павелічэння здабычы вугалю ў Польшчы патрабуецца не менш за 2-3 гады. Для гэтага неабходны значныя інвестыцыі і рост занятасці, а з гэтым ва ўрада цяжкасці. Як заўважыла Mysl Polska, для забеспячэння палякаў вуглём неабходна проста адмяніць эмбарга на яго імпарт з Расіі. Але, вядома, ніхто ў палітычным істэблішменце не скажа пра гэта адкрыта. У выніку мільёны палякаў могуць узімку замерзнуць.

### У ПЯЧОРНАЕ МІНУЛАЕ

Тым часам людзі штурмуюць лясы, каб нарыхтаваць галля на зіму, паведаміла выданне Wprost. Леснікі фіксуюць беспрэцэдэнтны і бескантрольны рост наведванняў зялёных масіваў па ўсёй Польшчы — ад Гданьска да Кракава і ад Беластока да Познані. З-за высокіх цэн на энерганосьбіты ў польскіх лясгасах ужо фарміруюцца чэргі па сухое галлё, а ахвотных набыць яго цяпер у разы больш, чым за ўвесь мінулы год, паведаміў партал навін Next.gazeta.pl.

Намеснік міністра клімату і навакольнага асяроддзя Польшчы Эдвард Сіярка даў дабро на збор галля, аднак пасля напльыву вяскоўых жыхароў супраць такой ініцыятывы выступілі лясніцтвы. Па словах чыноўнікаў, неабходна атрымаць згоду леснікоў, а збор дроў у лесе без згоды ляснічага пагражае штрафам да 250 злотых (каля 190 рублёў). Некаторыя лясніцтвы ўжо ўводзяць ліміты, напрыклад, да 30 кубаметраў драўніны.

Тым часам у польскіх сацсетках разважныя палякі высмейваюць ініцыятыву ўлад, шкадуючы, што ў выніку канфлікту з Расіяй краіна скочваецца ў пячорнае мінулае. Напрыклад, інтэрнэт-карыстальнік Анка Хілінская піша з горкай іроніяй: «Сардэчна запрашаем у свет казак Крашэўскага!..». EADaily удакладніла, што польскі пісьменнік XIX стагоддзя Юзаф Крашэўскі вядомы сваімі апавяданнямі аб дахрысціянскай Польшчы, калі на сённяшніх польскіх землях жыло паганскае племя палян.

### КАТАСТРОФА НА БАЛТЫЦЫ

Яшчэ адзін з вынікаў бязглуздых антырасійскіх санкцый — экалагічная катастрофа ў Балтыйскім моры. Пра гэта заявіў прадстаўнік польскай кампаніі па ачыстцы каналізацыйных сцёкаў Міхал Дудэк. Польскія экалагічныя арганізацыі б'юць трывогу: з-за таго, што Варшава ўключыла ў санкцыйны спіс кампанію Sulzer, якая спецыялізуецца на ачыстцы каналізацыйных сцёкаў, аказаўся заблакіраваны рамонт абсталявання ў польскіх гарадах, якія прымыкаюць да Балтыйскага мора. Выхад са строю каналізацыі пагражае забруджваннем Балтыкі і, як вынік, міжнароднай экалагічнай катастрофай.

Па словах прадстаўніка кампаніі Міхала Дудэка, у фірмы заблакіраваныя паліўныя карты, аўтамабілі забрала лізінгавая кампанія, а тэлефоны адключылі з-за нявыплаты. «Мы не можам аказваць паслугі або выдзяляць запасныя часткі, незалежна ад таго, знаходзіцца прылада на гарантыі ці не. Наблiжаецца экалагічная катастрофа. Гэта рэальная пагроза для здароўя і жыцця людзей», — заявіў Дудэк.

Што робіць у такой сітуацыі ўлады? Правільна, яны плануюць сур'ёзна ўзмацніць магчымасці сваіх Узброеных сіл. Для гэтых мэт у краіне хочуць стварыць шматмільярдны фонд, заявіў намеснік кіраўніка ўрада Польшчы, кіраўнік абароннага ведамства Марыюш Блашчак, паведаміла РІА «Навіны». Налета расходы на абарону ўзрастуць да 3 працэнтаў ВУП. Акрамя гэтага, ствараецца спецыяльны фонд, сродкі якога пойдуць на ўмацаванне арміі. Ён будзе пазабюджэтным і папаўняцца за кошт запазычанняў і выпуску аблігацый. Сёлета памер фонду складзе $4,5 млрд. А налета гэтую суму плануецца павялічыць амаль у 2,5 раза — да $11 млрд. Таксама, як заявіў лідар кіручай у краіне партыі «Права і справядлівасць» Яраслаў Качыньскі, польскае войска можа быць павялічана з цяперашніх 150 тыс. да 400 тыс. чалавек. А людзі няхай галлё збіраюць, ды на хлебе эканомяць. Вось і ўся сутнасць польскіх улад.

**Пётр ДУНЬКО.**

**ДАСЛОЎНА**

### «ВЕЛЬМІ НАПРУЖВАЕ ПАЛІТЫКА НА КАНФРАНТАЦЫЮ»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што палітыка кіраўніцтва Польшчы і Літвы на канфрантацыю вельмі напружвае. Адпаведную заяву ён зрабіў на сустрэчы з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным, паведаміла БелТА.

«Нас вельмі напружвае сітуацыя і тая палітыка, якую праводзяць нашы суседзі. Вы, увогуле, ведаеце. Гэта кіраўніцтва Польшчы і кіраўніцтва Літвы. Палітыка на канфрантацыю. І вам хапае ад іх», — заўважыў беларускі лідар. Ён звярнуў увагу, што ва Украіне апошнім часам наймітаў найбольш з Польшчы. «Я не разумею, навошта гэта ім трэба — канфрантацыя. Ясна, што за спінай стаяць, падштурхоўваюць, але палітыка агідная. Паводзіны агрэсіўныя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

# ЛЕТА МАЙГО ДЗЯЦІНСТВА

***З пачаткам лета, а, можа, і раней, бацькі задумваюцца аб тым, як арганізаваць адпачынак свайму дзіцяці. Пакуль адны збіраюць малых у аздараўленчы летнік або школьны лагер, іншыя дамаўляюцца з бабулямі і дзядулямі, каб яны прыглядзелі за сваімі нашчадкамі. Тыя, каму разлічваць асабліва няма на каго, спраўляюцца ўласнымі сіламі.***

*Летніх канікул чакаюць усе дзеці без выключэння. Вядома, у свой час не магла іх дачакацца і я. І не таму, што, як некаторыя мае аднагодкі, разам з бацькамі выбіралася да мора. Такой магчымасці мы не мелі. Сваё першае мора я ўбачыла толькі студэнткай. І тое дзякуючы «Звяздзе», дзе ўжо знаходзілася ў штаце, — газета выправіла мяне ў камандзіроўку ў Анапу. Ніколі, прызнацца, не была і ў летніках — начаваць па-за сценамі дома для мяне па тым часе было найгоршым выпрабаваннем. Тым больш летам у вёску з'язджаліся сябры, знаёмыя, якіх не магла прычакаць увесь навучальны год.*

*Праўда, у лагеры — школьным, працоўным — даводзілася быць неадночы. Кожнае лета школьнікі, найбольш старшакласнікі, аказвалі пасільную дапамогу калгасу: то бульбу і буракі палолі, то вычышчалі з пліткі траву, то на палетках збіралі камяні, кідаючы іх у прычэп трактара, які ішоў наперадзе... Гэта сёння, за рэдкім выключэннем, дзеці ў лагеры адпачываюць. Нам жа адпачынак быў патрэбны пасля яго. Праўда, ненадоўга — няполатыя грады чакалі яшчэ і на ўласным агародзе.*

*Гэта цяпер думаеш, што першы месяц канікулаў мы праводзілі зусім не адпачываючы. Тады пра гэта ніхто не разважаў: трэба — значыць трэба. Тым больш ад працоўнага лагера можна было адмовіцца. Аднак не хадзілі туды адзінкі. Большасць пагаджалася, бо разам праводзіць час было яшчэ і весела. Да таго ж калгас плаціў нам грошы — няшмат, вядома, але набыць некалькі абновак на лета або да новага навучальнага года мы маглі сабе дазволіць. І нават не трэба было прасіць у бацькоў!*

*Вядома, хапала часу і для дзіцячых забаў. Гойсалі з сябрамі на веласіпедах, амаль кожны дзень (калі дазваляла надвор'е) купаліся то ў возеры, то ў рэчцы — выбар у вёсцы быў вялікі. Па вечарах хадзілі ў сельскі клуб на дыскатэку. Калі танцаў не было, за тры-чатыры кіламетры шпацыравалі ў суседнія вёскі. Хоць дома з'яўляліся позна (вядома, было тое ў старшых класах), раніцай да абеду не спалі. Да поўдня, пакуль яшчэ не так горача, паспявалі з мамай па літры-другім ягад назбіраць. Потым гэтую смакату елі: перацертыя суніцы ці чарніцы са свежай булкай і малаком былі лепшыя за любыя цукеркі. Толькі пасля таго, як мы нацешымся ягадамі, мама варыла з іх варэнне. Потым лічыла слоічкі, акцэнтаваўшы пры гэтым увагу на багатым асартыменце: было і па дзесяць, і па пятнаццаць відаў варэння з розных ягад.*

*Асацыіруюцца школьныя канікулы і з вёскай, куды я выпраўлялася са свайго Мажэйкава, якое ў параўнанні са Шпількамі, дзе жылі мае бабуля і дзядуля па бацькавай лініі, здавалася горадам. У Шпільках была сапраўдная вясковая абстаноўка, у якой любілі бавіць час мае гарадскія сястрычкі і брат. Праўда, без справы не сядзелі і там: пасвілі разам з дзедам карову, хадзілі ў ягады ды грыбы, збіралі ўраджай у вялікім дзедавым садзе... І цяпер памятаю, як любілі бавіць час у гумне і качацца на свежаскошанай траве, на сене, якое адурманьвала сваім водарам. Не маглі дачакацца вечара, каб падсмажыць кавалачак сала ды хлеба на вогнішчы. З зачараванасцю назіралі за тым, як дзед Іван здымаў з сотаў мёд, а бабуля Тэня пякла найсмачнейшыя ў свеце бліны.*

*Калі ў іх я была часта, незалежна ад пары года (нейкія тры кіламетры, якія раздзяляюць нашы вёскі, напрасткі праходзіла за паўгадзіны), то ў матчыных бацькоў, якія жылі ў Баранавічах, у асноўным гасцілі летам. Паездкі гэтыя былі падобныя да нейкага ўрачыстага рытуалу: пачынаючы ад збору рэчаў, заканчваючы сустрэчай на вакзале. А яшчэ была працяглая дарога да цягніка, які вёз нас у самы цудоўны горад на зямлі, як мне тады здавалася. Не паспявалі за намі зачыніцца дзверы, як мне трэба было даставаць перакус, які мама заўсёды брала з сабой. Вядома, галоднымі ў дарогу ніколі не збіраліся, але як гэта так, каб ехаць у цягніку ды нічога не з'есці! У саміх Баранавічах гарадскія бабуля і дзядуля забаўлялі адзіную ўнучку як маглі: вадзілі на каруселі, па абноўкі на базар, у кінатэатр, дзіцячае кафэ. Я адчувала сябе ў іншым свеце, а ў «свой» райцэнтр ездзілі з бацькамі толькі па справах.*

*...Даўно ўжо няма ні маміных бацькоў, ні дзеда Івана. Засталася толькі бабуля Тэня, якая сама апошнім часам на вёску, у сваю родную хатку, прыязджае з дачкой толькі летам. Раней жа штолета яна брала на сябе клопат аб шасці ўнуках, цяпер клапаціцца ўжо трэба пра яе. Забываць пачала многае, а вось тое, што было раней — падчас лета майго дзяцінства, — памятае дагэтуль.*

***Вераніка КАНЮТА.***

Сямейная газета

Выпуск № 10 (192)

Тыя, хто побач

**Наталля НАРЭЙКА:**

# «У ТЫМ, ШТО МЫ ПРАЦУЕМ РАЗАМ, ЁСЦЬ ПЭЎНЫ БОНУС»

**Кожны новы дзень у сям'і Нарэйкаў пачынаецца са слоў: «Добрай раніцы, каханы» і «Добрай раніцы, каханая!». Рэпетыцыі, запісы новых песень, канцэрты, гастролі, творчыя праекты — абавязковыя элементы іх штодзённых будняў. Сужэнцы Наталля і Яўген — заснавальнікі фольк-гурта «Славянскія рытмы», які з'явіўся на свет якраз у год іх вяселля. Нягледзячы на тое, што яны ўвесь час разам — і дома, і на рабоце, — маладой пары заўсёды цікава быць побач адно з адным. Вось ужо восем гадоў яны насуперак шматлікім стэрэатыпам шчаслівыя і ў творчасці, і ў сямейным жыцці. З-за шчыльнага графіка артыстаў нам удалося пагаварыць толькі з Наталляй — цудоўнай жонкай, чулай жанчынай і таленавітай салісткай гурта. Яна расказала пра шлях да музыкі, стварэнне сумеснага з мужам творчага калектыву, каханне і іх з Яўгенам сямейныя традыцыі.**



***— Усё пачынаецца з сям'і. Наталля, раскажыце пра сябе, бацькоў, традыцыі, што панавалі дома. Ваша схільнасць да народнай музыкі, напэўна, перадалася ад родных?***

— Выбар у бок музыкі дапамог мне зрабіць тата Сяргей Барысавіч. Мне было шэсць гадоў, калі бацькі запісалі мяне ў музычную школу па класе баян. Шчыра сказаць, асаблівага энтузіязму да ігры на гэтым інструменце ў мяне не назіралася. Памятаю, бацька нават даваў мне грошы, каб я развучвала музычныя творы па баяне (*смяецца*). Справа ў тым, што ён валодае ад прыроды прыгожым, пастаўленым тэмбрам голасу, і, як кажуць, гэты голас па спадчыне перадаўся мне.

Родам я з вёскі Дабромысль, што ў Івацэвіцкім раёне Брэсцкай вобласці. У маім дзяцінстве ў нашай сям'і вечарамі любілі спяваць. Разам з бацькам і матуляй Людмілай Мікалаеўнай мы выконвалі народныя песні пад мой акампанемент на баяне. Але больш за ўсё мне падабаліся, вядома, спевы. Так я зразумела, што маё прызванне — спяваць песні, і менавіта народныя.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Нататкі наваспечаных вяскоўцаў

# ЯБЛЫЧНЫ СЫР

**Бачылі, як багата кветак сёлета было ў садах? Так што, дасць бог, гэты год будзе яблычны. Прынамсі, у мяне напалеонаўскія планы на нашы вусьлянскія антонаўкі. Дарэчы, менавіта гэтыя сонечныя яблыкі з кіслінкай Уладзімір Караткевіч лічыў найлепшымі ў свеце.**

Тры старыя аўтэнтычныя яблынькі мы купілі разам з участкам. Тады яшчэ нават не падазравалі, які скарб адхапілі ў дадатак. Пасля ўжо суседзі распавялі, што нашы антонаўкі адны такія на ўсю вёску, пасаджаныя неўзабаве пасля вайны, таму ім не меней як 75 гадоў. Адно дрэўца, праўда, так і не ўдалося ўратаваць. А два, спадзяюся, яшчэ доўга будуць ствараць цень у сонечны дзень ды радаваць нас восенню пахучымі залатымі яблычкамі. Тым больш летась муж прывёў іх у парадак, абрэзаў сухія галіны, амаладзіў. А сёлета, каб захаваць аўтэнтычны сорт, вырашыў паспрабаваць метад капіравання дрэў «паветранай адводкай». У якасці мяшэчка для зямлі ўзяў лупіну ад апельсіна і падвесіў на яблыню. Праз месяц-другі, кажа, па ідэі павінны вырасці карэньчыкі. А ўвосень можна адрэзаць галінку ніжэй за цытрус і высадзіць гатовы саджанец на ўчастку. Калі верыць інтэрнэту, пры дапамозе гэтага метаду выходнае дрэва капіруецца на 100 працэнтаў.



Наогул, у майго мужа пасля пераезду ў вёску з'явілася прыгожая мара. Адрадзіць, не даць памерці старым сартам яблынь. Пачаў з таго, што нарыхтаваў чаранкі з малінаўкі і карабкоўкі, якія яго дзядуля шмат гадоў таму садзіў на лецішчы пад Віцебскам. Саджанцы, якія атрымаліся ў выніку прышчэпкі, зараз падрастаюць у нас на ўчастку. Больш за тое, Уладзь настолькі захапіўся сваёй ідэяй, што напрышчапляў дзічак на ўскрайку лесу ды каля ракі. Кажа, што праз колькі гадоў галоднаму мінаку будзе чым падсілкавацца.

Наш трохгадовы сын вельмі любіць яблыкі, гатовы есці іх штодзень. Праўда, крамныя нас з мужам не надта радуюць. Ні табе смаку, ні водару — так, адна назва. Сымон, відаць, таксама адчувае падвох, таму штодзень, робячы разам з татам абход, гладзіць маладзенькія дрэўцы і з нецярпеннем чакае, калі можна будзе есці сапраўдныя сакавітыя малінаўку, папяроўку, карабкоўку. Асабіста ж я не забягаю настолькі далёка наперад: пакуль сплю і бачу, як па восені буду варыць яблычны сыр з антонаўкі.

*(Заканчэнне на 6-й стар. «СГ».)*

Духоўны свет

# Што Бог злучыў, чалавек падзяляць не павінен

## З праваслаўнага пункту гледжання, толькі таінства царкоўнага вянчання робіць двух людзей сям'ёй

**У таінстве вянчання закладзены глыбокі сэнс. Вырашыцца на царкоўны шлюб мужчына і жанчына могуць, спытаўшы сябе, ці гатовыя яны прайсці рука аб руку ўвесь свой доўгі жыццёвы шлях. Але ў нашы дні маладыя, здараецца, вянчаюцца, таму што «гэта прыгожа», таму што гэта цікавая частка вясельнай праграмы і старажытны цудоўны звычай. Або таму, што бралі шлюб іх сябры ці сваякі...**
**Як правільна ставіцца да таінства вянчання, каб сям'я была моцнай, а сумесны жыццёвы шлях мужчыны і жанчыны — шчаслівым, мы спыталі ў настаяцеля прыхода храма Свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, святара Аляксандра ПАЛЬЧЭЎСКАГА.**



### АБЯЦАННЕ ХРЫСТУ

Для таго, каб стаць мужам і жонкай з пункту гледжання закона, сёння дастаткова зарэгістраваць шлюб у ЗАГСе, атрымаць славуты «штамп у пашпарце» і пасведчанне аб шлюбе. Супрацоўнікамі органа запісу актаў грамадзянскага стану рашэнне аб стварэнні сям'і, прынятае жаніхом і нявестай, рэгіструецца — як публічнае сведчанне іх адказнасці адно за аднаго і за будучых дзяцей. Гэта неабходна ў першую чаргу для юрыдычнага прызнання правоў мужа і жонкі — каб засцерагчы іх, калі «сямейная лодка разаб'ецца аб побыт». Пры разводзе дзяліць маёмасць працей людзям, якія афіцыйна зарэгістравалі свае адносіны, чым тым, хто жыў у грамадзянскім шлюбе.

— Сапраўды, бывае, што маладыя ставяцца да вянчання як да часткі вясельнай праграмы, — кажа святар. — Правільна ставіцца да гэтага таінства як да богаслужэння — гэта значыць, да служэння Богу. Усе царкоўныя таінствы заўсёды звязаныя з галоўным таінствам — Прычасцем. Таму вянчанне часта адбываецца пасля боскай літургіі. Пары, якія жывуць царкоўным жыццём, заўсёды вельмі адказна ставяцца да вянчання. Яны рыхтуюцца да яго, праводзяць папярэднія дні ў посце. У дзень вянчання прыходзяць да літургіі разам, прычашчаюцца Святых Хрыстовых Таінстваў і толькі пасля гэтага ўдзельнічаюць у таінстве вянчання. Так адбываецца ў хрысціянскай сям'і. Да вянчання трэба ставіцца як да вельмі трапяткога, свяшчэннага, важнага духоўнага дзейства.



У царкоўнага вянчання — зусім іншыя мэты. Таінства вянчання дае магчымасць мужу і жонцы засведчыць перад Богам і царквой свой намер жыць у міры і любові па запаведзях Божых, дапамагаць адно аднаму ісці за Хрыстом, выхоўваць дзяцей у хрысціянскай веры.

— Вянчанне — адно з сямі таінстваў Праваслаўнай царквы, — тлумачыць айцец Аляксандр. — Кожнае таінства прадугледжвае прысутнасць Бога ў тым дзеянні, якое здзяйсняецца ў храме. Святар з'яўляецца выканаўцам вонкавым, але духоўна, нябачна падчас таінства дзейнічае сам Бог. І гэта справядліва і ў выпадку з таінствам вянчання: адбываецца асаблівае ўздзеянне благадаці Святога Духа на мужчыну і жанчыну, якія ўяўляюць сабой сям'ю, адно цэлае.

Модзе падпарадкоўваюцца многія сферы жыцця, а калі казаць аб вясельнай індустрыі, тут мода моцная як нідзе. Яна закранае не толькі выбар сукенкі, рэстарана і лімузіна, але і такое важнае пытанне, як вянчанне.

Іншымі словамі, у храме саюз мужчыны і жанчыны благаслаўляе Бог. І гэта дзейства ў першую чаргу мае на ўвазе доўгае сумеснае жыццё, а пра магчымасць разводу, хай і гіпатэтычную, гаворкі тут не вядзецца.

— Развод магчымы нават пасля вянчання, і, на жаль, часам мы гэта бачым. Калі адбываецца развод свецкі, царква канстатуе, што шлюб губляе сілу, свой кананічны змест. Вядома, заўсёды Царква клапоціцца аб тым, каб сям'я была захавана. Святар праводзіць гутаркі, імкнецца падтрымаць двух людзей, якія сутыкнуліся з цяжкасцямі ў адносінах. Калі ні мы разумеем, што захаваць сям'ю немагчыма, пытанне пераходзіць у веданне архіерэя. Калі ён прымае рашэнне прызнаць царкоўны шлюб несапраўдным, аб гэтым выдаецца пасведчанне.

### У ПЛОЦЬ АДЗІНУЮ

І ўсё ж таінства вянчання — дзейства, накіраванае на вечны саюз: «што Бог злучыў, тое чалавек не павінен падзяляць», сказана ў Евангеллі (Мк 10: 9).

— Па словах апостала Паўла, шлюб падобны да саюза Хрыста і Царквы, — тлумачыць суразмоўца. — Муж ёсць галава жонкі, як і Хрыстос — галава Царквы. Як Царква падпарадкоўваецца Хрысту, так і жонкі — сваім мужам. І яшчэ сказана: «Мужы, любіце сваіх жонак, як і Хрыстос палюбіў Царкву і аддаў Сябе за яе». Саюз, адзінства і любоў мужчыны і жанчыны ў хрысціянстве параўноўваецца з адзінствам і любоўю, якія існуюць паміж Богам і Царквой. Адзін святар сказаў: «Акрамя маёй жонкі, усе астатнія жанчыны пасля шлюбу для мяне быццам бы памерлі». Для яго існуе толькі адна жанчына — гэта і ёсць хрысціянскі шлюб.

«Павінны мужы любіць сваіх жонак, як свае цела, — кажа апостал Павел, — бо ніхто ніколі не меў нянавісці да сваёй плоці, а корміць і грэе яе». Гасподзь сказаў: «Пакіне чалавек бацьку і маці і прылепіцца да жонкі сваёй, і будуць двое адною плоццю. Што Бог злучыў, таго чалавек ды не разлучае». Такім чынам, вянчанне — гэта заключэнне саюза мужа і жонкі і ў зямным жыцці і нават пасля смерці. А значыць, каб вянчацца, трэба быць хрысціянінам і верыць у вечнае жыццё.

### АДНО АДНАГО НЯСІЦЕ НЯГОДЫ...

Заўважым, што вянчанне магчыма толькі пасля таго, як у ЗАГСе пастаўлены штамп.

— Абавязковая ўмова для вянчання — удзельнічаць у таінстве могуць толькі людзі, якія знаходзяцца ў афіцыйным шлюбе. Справа ў тым, што ў храме саюз мужчыны і жанчыны благаслаўляецца Богам і прызнаецца Царквой, калі да шлюбу няма перашкод.

Святар можа адмовіць пары ў вянчанні. Гэта адбываецца, калі адзін або абодва маладыя не хрысціяне ці не ахрышчаны; адзін або абодва непаўналетнія; адзін або абодва ўжо знаходзяцца ў шлюбе; муж і жонка знаходзяцца ў кроўным сваяцтве (напрыклад, стрыечныя брат і сястра); адзін з маладых ужо браў шлюб тры і больш разоў; чалавек даў манашскія абяцанні, і ў некаторых іншых выпадках. Як бачым, такога пункта, як «неўцаркоўленасць» або «вянчанне як даніна модзе» ў гэтым спісе няма. Але са свайго боку святары імкнуцца зрабіць усё, каб маладая пара ўсвядоміла важнасць свайго рашэння і зразумела сэнс таінства.

— Сёння перад вянчаннем ва ўсіх праваслаўных храмах праводзяцца гутаркі са святаром. І лепш, калі гутарка будзе не адна, а некалькі. Святары імкнуцца растлумачыць маладым самае галоўнае — сэнс і змест таінства вянчання і паняцце хрысціянскага шлюбу.

Трэба падумаць, вучаць святары, ці зможаш ты быць да канца верным свайму мужу (або сваёй жонцы)? Нават у выпадку, калі ён (ці яна) сур'ёзна захварэе або пазбавіцца працаздольнасці ў выніку няшчаснага выпадку? Ці зможаце вы «несці нягоды адно аднаго», як наказана Бібліяй?

— Падчас вянчання ёсць сімвалічнае дзейства: мужу і жонцы прапануецца выпіць віно з агульнай чары. Гэта старажытны звычай, сімвал цуду, які здзейсніў Гасподзь, ператварыўшы ваду ў віно. А яшчэ гэта сімвал таго, што цяпер гэтыя мужчына і жанчына будуць дзяліць пароўну радасці і беды.

Калі святар адчувае, што рашэнне маладых — не заклік душы, а даніна модзе, ён можа прапанаваць ім адкласці вянчанне для таго, каб яны больш адказна падрыхтаваліся да таінства.

### ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Успрымаючы вянчанне проста як прыгожы старадаўні абрад, часам людзі забываюць, што дэталі, надзвычай важныя для сучасных маладых (лімузін, вясельныя строі, відэааператар і гэтак далей) на самай справе на вянчанні зусім не абавязковыя. Трэба ўлічыць усяго некалькі патрабаванняў. Найважнейшае з іх — разуменне сутнасці вянчання і прыняцце яе. І папярэдні ўдзел у літургіі, без якога таінства вянчання ператворыцца проста ў фармальнасць.

— На вянчанні неабходныя пярсцёнкі, вянчальныя свечкі, ручнікі (іх можна купіць у храме), вянчальныя абразы Збавіцеля і Багародзіцы (гэтыя абразамі святар благаслаўляе маладых), а таксама вянцы (яны заўсёды ёсць у царкве), — кажа айцец Аляксандр.

Што датычыцца кошту вянчання, у кожным храме ён свой, і часцей за ўсё гэта ахвяраванне ад сям'і, памер якога вызначаецца асобамі, якія бяруць шлюб. Таксама важна памятаць, што вянчанне здзяйсняецца не ў любы дзень: у святочныя дні або ў дні строгага посту гэта немагчыма.

Той звычай вянчання, які мы ведаем сёння, цалкам аформіўся да IX стагоддзя ў Візантыі. Заручальныя пярсцёнкі ў тыя часы часта выконваліся ў выглядзе пячаткі, якой можна было змацаваць юрыдычны дакумент, напісаны на васковай таблічцы. Гістарычна пярсцёнак — сімвал улады: «Жонка не ўладная над сваім целам, але муж; гэтаксама і муж не мае ўлады над сваім целам, але жонка», сказана ў Пісанні. Абменьваючыся такімі пячаткамі (лічыцца, што жонка носіць пярсцёнак мужа і наадварот), муж і жонка давяралі адно аднаму не толькі сваю маёмасць, але і сваё цела — гэта значыць, ніякія здрады пасля царкоўнага шлюбу недапушчальныя. Гэта сімвалічнае значэнне замацавалася за пярсцёнкамі да нашых дзён: вернасць, адзінства, непарыўнасць сямейнага саюза. Пярсцёнкі могуць быць зробленыя з любога матэрыялу, неабавязкова золата. Падпаленыя свечкі ў руках маладых сімвалізуюць чысціню шлюбу: «Хто паступае па праўдзе, ідзе да святла, каб яўныя былі ўчынкі ягоныя, бо яны ў Богу зробленыя». А вянкі, якія трымаюць над галовамі маладых падчас таінства, сведчаць аб царскай годнасці маладых, якім трэба будзе будаваць сваё царства ў асобна ўзятай сям'і.

**«Адзін святар сказаў: «Акрамя маёй жонкі, усе астатнія жанчыны пасля шлюбу для мяне быццам бы памерлі». Для яго існуе толькі адна жанчына — гэта і ёсць хрысціянскі шлюб».**

— Вянкі — старажытны сімвал не толькі царскай годнасці, але і Царства Нябеснага, да якога заклікаНЫ ўсе хрысціяне. Жыццё ў сям'і, якая вызначаецца як «малая царква», павінна спрыяць духоўнаму развіццю мужа, жонкі і дзяцей, каб яны маглі ўвайсці ў Царства Божае, — тлумачыць святар.

Іконы ж застаюцца на памяць павянчанай пары, як сімвал благаславення Божага.

— Ёсць сем'і, дзе жывая традыцыя перадаваць вянчальныя абразы з пакалення ў пакаленне — напрыклад, ад маці да дачкі.

І напрыканцы — яшчэ адна рэкамендацыя парам, якія вырашылі замацаваць свой саюз царкоўным шлюбам. Адкрытыя вясельныя і вячэрнія сукенкі на шлюбе недапушчальныя (аб адпаведным знешнім выглядзе трэба падумаць не толькі маладым, але і іх гасцям). Для наведвання храма наогул, а для ўдзелу ў таінстве асабліва варта выбіраць вопратку больш доўгую, без разрэзаў і дэкальтэ.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# «У ТЫМ, ШТО МЫ ПРАЦУЕМ РАЗАМ, ЁСЦЬ ПЭЎНЫ БОНУС»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— У школьныя гады я прымала ўдзел у розных абласных мерапрыемствах, зарабляла свае першыя грошы. Неаднаразова чула: як такая маленькая, худзенькая дзяўчынка можа спяваць такім моцным нізкім голасам — альтом? І сапраўды, гэта крыху нехарактэрна для такога знешняга апісання (*смяецца*).

Я вырашыла далей сябе развіваць у музычнай дзейнасці. Збіралася і рыхтавалася паступаць у Брэсцкі музычны каледж імя Р. Шырмы. І ў той жа час праходзілі экзамены ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. І зноў жа, бацька прапанаваў паспрабаваць паступаць у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў — маўляў, гэта будзе... рэпетыцыя паступлення ў каледж. Я была ўпэўнена, што не паступлю, бо адносілася да гэтага сапраўды як да рэпетыцыі. Аднак паступіла, прычым на бюджэт (*усміхаецца*). Наколькі памятаю, ахвотных было шмат, а набіралі ў той год усяго чатыры чалавекі.

***— А як узнік ваш з мужам сумесны праект «Славянскія рытмы»?***

— У год нашага вяселля, у 2013-м, трэба было зрабіць музычнае віншаванне нашым знаёмым. Мы з мужам Жэнем хуценька арганізавалі гэтую справу. Ён па адукацыі харэограф. Так і ўзнік наш калектыў «Славянскія рытмы». Першапачаткова гэта быў наш з ім дуэт. А з 2017 года ў складзе «Славянскіх рытмаў» — пяць чалавек, сярод якіх інструменталісты — баяніст і цымбалістка, два харэографы і вакалістка. Працуем як цалкам ужывую, так, калі гэта масавыя, больш маштабныя мерапрыемствы, і пад «падложку». Яна ўяўляе сабой запісаную ўдарную ўстаноўку і бас, паверх якой ужывую іграюць музыканты. Падложка дапамагае дасягнуць большага каларыту ў гучанні. Працуем на розных пляцоўках, да пандэміі нават выязджалі за мяжу. Кожны наш артыст, удзельнік калектыву, з'яўляецца лаўрэатам рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў, сярод нас ёсць лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.



***— Ваш гурт мае прыстаўку фольк. Ці значыць гэта, што ў рэпертуары калектыву пераважаюць народныя спевы?***

— У рэпертуары нашага калектыву — беларускія, рускія, украінскія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы. Мы з мужам паважаем традыцыі, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Але, разумееце, свет змяняецца, таму нам даводзіцца ісці ў нагу з часам. І, тым не менш, мэта нашага калектыву — захаваць народную песенную спадчыну. Моладзь неахвотна ўспрымае народныя спевы і танцы, а хочацца прывіць ім да гэтага любоў. Таму, каб было цікава, мы ствараем мікс з сучаснага і народнага, імкнёмся да ўнікальнасці і непаўторнасці. Распрацоўваем дызайн сцэнічных касцюмаў, абавязкова з нацыянальнымі элементамі, усё павінна быць ярка, захапляльна, сучасна, бо гэта — сцэна. Мы прапаноўваем пэўную задуму, ідэю, а шыюць праверaныя майстры, з якімі працуем ужо не адзін год.



***— Як вы сумяшчаеце работу і сям'ю? Не надакучвае ўвесь час быць разам?***

— Пачну з гісторыі нашага знаёмства. Мужа я называю Жэнька — гэта гучыць для мяне душэўна і цёпла (*усміхаецца*). Мы пазнаёміліся з ім ва ўніверсітэце, жылі на адным паверсе ў інтэрнаце. І не ведалі адно аднаго, пакуль не прыйшлося паехаць калектывам на гастролі ў Германію. З той пары сталі бліжэй. Як ні дзіўна, я адносілася да Жэнькі як да сябра. Мяне бацькі выхоўвалі ў даволі строгіх умовах. На першым месцы была вучоба, кар'ера, а ўжо астатняе — потым. Але Жэнька малайчына, не здаваўся (*смяецца*). І дзякуй яму за гэта: калі б не яго настойлівасць, упартасць, нічога не атрымалася б. Цяпер, шчыра сказаць, я не бачу сябе без яго. Раней мы з ім працавалі ў дзяржаўным ансамблі народнай музыкі «Свята», цяпер працуем разам у заслужаным калектыве Рэспублікі Беларусь Дзяржаўным акадэмічным ансамблі танца Беларусі. Камандзіроўкі, гастролі, рэпетыцыі — таму, вядома, мы ўвесь час разам. Упэўнена можам сказаць: не, нам не надакучыла. Гэта вельмі важна, адносіны толькі мацнеюць. Мне нават, наадварот, не хапае Жэнькі. Шчыра сказаць, я не разумею, калі гавораць: адпачніце адно ад аднаго. Як? Можна ж адпачываць і разам (*смяецца*). Што мы і робім вось ужо на працягу васьмі гадоў!

***— Як святкавалі вяселле?***

— Вяселле праходзіла ў горадзе Смаргоні, дзе прайшло дзяцінства мужа. Жэня родам з Літвы. Яны з бацькамі пераехалі ў Смаргонь, калі яму было каля сямі гадоў.

Сям'я ў нас творчая, таму натуральна, што сярод гасцей на вяселлі былі творчыя людзі, і кожны, вядома, стараўся зрабіць пэўны музычны падарунак. Было настолькі весела, што нашы запрошаныя музыканты крыху перажывалі, што застануцца без ганарару, бо яны практычна не працавалі (смяецца). Увесь час на нашым свяце спявалі госці, таму сваякі з Літвы і Іспаніі, якія прысутнічалі на вяселлі, да гэтага часу ўспамінаюць наш дзень як самы запамінальны і вясёлы.

***— Наталля, раскажыце, чым здзіўляе муж, які падарунак даражэйшы за ўсе?***

— Жэнька ў плане падарункаў настолькі крэатыўны, што не перастае мяне здзіўляць! Таму падарункі ў нашым жыцці не толькі па святах, але і ў звычайныя дні. Самы першы незабыўны падарунак быў у студэнцкія гады. Памятаю валянцінку на ўсе дзверы. Як пасля аказалася, Жэнька не спаў усю ноч, рыхтаваўся да гэтага свята, пялёсткамі ружаў клеіў надпіс: «Я цябе кахаю». Дзверы інтэрнацкага пакоя былі ўпрыгожаны паштоўкамі з пажаданнямі. Цікава тое, што ўсе прыходзілі паглядзець на маю валянцінку. І гэта вельмі прыемна. Матэрыяльныя падарункі таксама ў нашым жыцці маюцца, але вось такія, крэатыўныя, асабліва памятныя, бо душэўныя. Я ў сваю чаргу стараюся таксама не адставаць ад Жэнькі, хоць ён больш у гэтым плане крэатыўны. У мяне на старонцы ў «Інстаграм» natalianareiko відаць, што я магу таксама творча падысці да віншавання і зрабіць яму прыемнае.

***— Дарэчы, у вашым акаўнце вельмі шмат фота з падарожжаў...***

— Для мяне і для мужа вандраваць вельмі важна, мы любім наведваць розныя краіны. Адпачынак для нас — гэта не проста паляжаць на пляжы, паплаваць у моры, хоць, вядома, не без гэтага. Аднак выбіраем больш актыўны від адпачынку — экскурсіі, вельмі цікава паглядзець, як жывуць іншыя людзі ў розных краінах, пазнаёміцца з іх культурай, побытам. Бывалі ў Іспаніі, Лаосе, Кітаі, Літве, Польшчы, Латвіі, Чэхіі, Францыі, Малдове, Азербайджане, Італіі, Германіі, ААЭ, плануем і далей дадаваць краіны ў «скарбонку».

У тым, што мы працуем артыстамі, ёсць пэўны бонус: геаграфія вандровак пашыраецца. Летась у сувязі з пандэміяй адпачынак быў турыстычны — ездзілі адпачываць на Браслаўскія азёры: палатка, вячэра каля вогнішча, размовы да позняй ночы, сустрэча світанку...

***— Хто ў вас галоўны кухар у сям'і, якімі стравамі здзіўляеце адно аднаго?***

— Мой муж любіць паесці, а я люблю, калі мой муж сыты (*смяецца*). На кухні эксперыментую. Гатую што-небудзь новенькае. Так, некалі былі на гастролях у Італіі, з тых часоў палюбілася нам лазання. Стараемся гатаваць разам, вельмі часта Жэнька мяне песціць, не пускае лішні раз на кухню, гатуе сам. Падыходзіць, зноў жа, да гэтага крэатыўна, нават надзявае касцюм шэф-кухара.

***— У кожнай сям'і ёсць свае каштоўнасці і традыцыі. Якія яны ў вашай?***

— Для нас вельмі важныя сямейныя каштоўнасці.



Фольк-гурт «Славянскія рытмы».

У Жэнькі цудоўныя бацькі, дзякуй ім, дзякуй маім бацькам за тое, што яны вырасцілі нас такімі, якія мы цяпер ёсць. Мы іх шануем, па магчымасці стараемся іх наведваць. Усе нашы святы праходзяць у коле сям'і. Любім рабіць сюрпрызы. Дорым падарункі, пішам лісты Дзядулі Марозу, снедаем, вячэраем разам. Што датычыцца нашых традыцый — гэта, як і ў нашых бацькоўскіх сем'ях, вячэра пры свечках. Вельмі такое любім: утульна і душэўна атрымліваецца.

***— Што, на ваш погляд, самае галоўнае для шчаслівага сямейнага жыцця?***

**«Мы ствараем мікс з сучаснага і народнага, імкнёмся да ўнікальнасці і непаўторнасці. Усё павінна быць ярка, захапляльна, сучасна».**

— Захапляюся Жэнькам як таленавітым артыстам, гэта безумоўна, а таксама ён цудоўны сын і найлепшы муж. Для мяне ён самы лепшы, і ў будучыні, я ўпэўнена, будзе добрым бацькам. А самае галоўнае ў сямейным жыцці, на наш погляд, як банальна гэта ні гучала б, — узаемапавага, клопат, вядома ж, давер. Хоць, можа быць, гэта і сапраўды банальна, але для нас вельмі важна.

***— На развітанне дайце, калі ласка, некалькі парад пачынаючым парам...***

— Важна ўмець не толькі слухаць, але і чуць адно аднаго. Жыццё — такая штука, што без цяжкасцяў, на жаль, не бывае, але вельмі важна ўмець пераадольваць гэтыя складанасці, яны ёсць у кожнага. І пераадольваць разам. Калі ўжо ствараеце сям'ю, то разам, як гаворыцца, і назаўсёды. Калі не атрымліваецца нешта ў жыцці, нічога страшнага, галоўнае, што вы ёсць адно ў аднаго.

**Гутарыла Надзея ЗУЕВА.**
**Фота з уласнага архіва сям'і Нарэйкаў.**

## БЛІЦ-АПЫТАНКА

● **Самы запамінальны адпачынак**

— У Дубаі. Было вельмі спякотна, і мы з Жэнем да гэтага часу ўспамінаем, як там у спякоту пераадолелі шмат кіламетраў.

● **Сям'я — гэта...**

— Самае дарагое, што можа быць у чалавека.

● **Любімая песня**

— Усё залежыць ад настрою, бліжэй за ўсе — народная.

● **Любімае сямейнае свята**

— Новы год.

● **Мара**

— Ёсць кватэра, але гэта не тое, хочацца мець уласны дом, каб было ўтульна, цёпла і душэўна, каб праводзіць вечары каля каміна.

● **Кніга**

— «Як перастаць непакоіцца і пачаць жыць», Дэйл Карнэгі.

● **Колер**

— Бірузовы.

● **Каханне — гэта...**

...тое, што дае ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

# ІДЭАЛЬНАЯ НЯНЬКА,

### або Як знайсці сваю Мэры Попінс

**«Сябры, парэкамендуйце, калі ласка, няньку. Толькі абавязкова правераную!» — апошнім часам бачу ў інтэрнэце даволі шмат падобных пастоў мам у дэкрэце і не толькі. Многія сучасныя жанчыны задумваюцца аб тым, каб наняць сабе памочніцу. У кожнай на гэта свая прычына. Хтосьці жадае працягнуць будаваць сваю кар'еру. Нехта не спраўляецца са штодзённай руцінай ці проста хоча прысвяціць больш часу сабе любімай. Разбіраемся, як не патануць у мностве прапаноў і зрабіць правільны выбар?**



## На адной хвалі з мамай

Пры выбары нянькі трэба кіравацца найперш патрэбамі вашай сям'і. Камусьці падыдзе лагодная Арына Радзівонаўна, якая будзе запоем чытаць казкі і песціць духмянымі піражкамі. А нехта аддасць перавагу маладой няньцы, якая робіць акцэнт на модным сёння раннім развіцці і з якой дзецям будзе весела падчас прагулак. Спецыялісты, якія працуюць у сферы падбору персаналу для сем'яў, у адзін голас кажуць, што ідэальнай нянькі, якая падышла б усім, не бывае. Усё вельмі індывідуальна. І раяць бацькам, перш чым прыступаць да пошуку сваёй ідэальнай нянькі, вызначыцца, для чаго яна ім патрэбна і якія абавязкі будзе выконваць. А таксама скласці спіс таго, чаго катэгарычна не змогуць прыняць у чалавеку, які будзе працаваць у іх доме.

**«Калі вы страшна баіцеся даверыць сваіх дзяцей чужой цётцы, то ў вас два выйсці: альбо не давяраць і цягнуць усё на сабе, альбо зрабіць цётку не чужой».**

Аптымальны ўзрост для нянькі — 45—60 гадоў. Браць на працу маладзейшага чалавека рызыкоўна, бо да 45 людзі, як правіла, будуюць кар'еру, займаюцца ўласнымі сем'ямі. Прыблізна палова кліентаў, распавялі ў адным са сталічных агенцтваў па падборы персаналу, што выбіраюць няньку ва ўзросце 55+. Бо пажылыя людзі нікуды не спяшаюцца — яны не кінуць у самы непадыходны момант. Больш за тое, пенсіянер можа пагадзіцца працаваць за ніжэйшы заробак — гэта таксама несумненны плюс. Але ў такіх нянек ёсць і свае мінусы. Часам пажылыя людзі спрабуюць навязаць свае парадкі ў доме, дзе працуюць, што недапушчальна. Яшчэ адзін важны момант — у іх не заўсёды дастаткова ведаў, а часам і жадання, каб вывучыць новыя методыкі выхавання. Спрабуюць выхоўваць чужое дзіця так, як 30 гадоў таму выхоўвалі свайго сына ці дачку. Але сучасныя дзеці ўжо не тыя, што былі раней... Дарэчы, чым меншае дзіця, тым больш нянька па сваім узаемадзеянні з ім павінна быць падобнай да мамы.

— Самае галоўнае — каб нянька спадабалася дзіцяці. Каб яны ладзілі адно з адным, — лічыць Галіна Леанідаўна, нянька з 20-цігадовым стажам. — Звычайна адразу відаць, будзе чалавек добра да дзіцяці ставіцца ці яму проста патрэбны грошы. Дзяцей не падманеш, яны адразу ж адчуваюць няшчырасць. А яшчэ нянька павінна быць прасунутай і шмат чытаць. У мяне быў выпадак, калі я па ўласных абставінах вымушана была сысці з сям'і, і тыя бацькі папрасілі мяне пратэсціраваць няньку, якую агенцтва даслала мне на змену. Якраз трэба было прыгатаваць дзіцяці сумесь. Дзяўчына ўбачыла, што я ўсё дакладна вымяраю, і кажа: «А навошта вы вымяраеце, давайце «на вока». Як на вока? Дзіця павінна з'ядаць 180—200 грам. Гэта яго норма. Нельга перакормліваць ці недакормліваць...

Сёння я прыйшла на працу. Гляджу, у Глеба чырвонае вочка. Сказала пра гэта яго маме: маўляў, паглядзіце, можа ў яго кан'юнктывіт. Яна дала мне лекі і кажа: «Вось гэтым прамыйце». Сама нянька ні ў якім разе нічога не павінна даваць дзіцяці без ведама бацькоў. Можна штосьці параіць, але рашэнне мама павінна прымаць сама. Нянька мусіць выконваць у дакладнасці ўсе распараджэнні і ўказанні, нават калі яны здаюцца ёй няправільнымі. Яшчэ адна важная якасць — уменне падстройвацца. Калі чалавек не лічыць патрэбным вывучыць рытуалы і правілы сям'і, не жадае быць на адной хвалі з бацькамі, то ўсе астатнія кампетэнцыі можна перакрэсліць.

З груднічкамі нянька павінна шмат размаўляць, тады і яны хутчэй загавораць. А з бацькамі — больш слухаць, чым гаварыць. Добрая нянька ніколі не праяўляе ініцыятыву ў стасунках з членамі сям'і. Паводзіць сябе, як рэферы на баксёрскім рынгу: той усё бачыць і прыкмячае, але імкнецца трымацца ўбаку, не замінаючы гледачам атрымліваць асалоду ад паядынку. Яшчэ важна, каб нянька была добрай, сумленнай, спагадлівай, вопытнай, чулай, прыстойнай, клапатлівай і нават з некалькі гіпертрафіраваным пачуццём адказнасці. Ну, і канешне, трэба любіць дзяцей. Без гэтага ў нашай прафесіі нікуды».

І яшчэ: калі кандыдат у нянькі сцвярджае, што будзе развіваць дзіця, наводзіць парадак у хаце, гатаваць і выгульваць сабаку, гэта, вядома, гучыць прывабна. Але, як правіла, усё з пералічанага будзе рабіцца дрэнна. Таму парада бацькам: калі вы запрашаеце няньку, то яна павінна выконваць адну функцыю — займацца дзіцем і ўсім, што з ім звязана. Не лішнім будзе зірнуць на водгукі былых наймальнікаў. У ідэале — нават пагутарыць з сем'ямі, у якіх нянька ўжо працавала не адзін год.

## «Такое золата можна перадаваць толькі з рук у рукі»

Добрыя нянькі перадаюцца з рук у рукі, як каштоўнасць, пераканана Святлана Зэрэ, бізнес-ледзі, мама траіх дзетак. І адкрыта дзеліцца сваім «досведам у кубе». «Са старэйшай дачкой Марыям я знайшла дзвюх нянек, якія маглі працаваць па паўдня. Іна пераехала з маленькага горада і шукала падпрацоўку да асноўнай працы, якая ніяк не была звязана з выхаваннем дзяцей. Першая наша сустрэча была на дзіцячай пляцоўцы, і мы хутка знайшлі агульную мову. Мяне ўсё задаволіла, але некалькі дзён я працавала дома, назіраючы, як Іна спраўляецца са сваімі абавязкамі. Менавіта гэта нянька была ў выніку з намі да пераможнага канца, а потым я знайшла ёй новую добрую сям'ю, таму што такое золата можна перадаваць толькі з рук у рукі.

Другую няньку, якая працавала пазменна з Інай, Святлана знайшла праз рэкамендацыю на «Фэйсбуку». «Нянька добра ладзіла з маёй дачкой, але ў яе быў недахоп — яна пастаянна крала прадукты, крэмы, шампуні, прычым як быццам незаўважна, часткамі — адлівала, адразала. Пудра новая знікла цалкам, прычым збіралася падарыць ёй жа. Але нават ведаючы гэта, я не развіталася з ёй своечасова, бо як нянька яна мне падабалася. Мне было не шкада, што яна ў мяне нешта крадзе, я аддавала гэта ў думках яе дзецям. Але калі ў мяне знікла тысяча долараў, якую я пакінула дома канкрэтна на падарожжа, мы расталіся. Міліцыю я не выклікала, адносінаў не высвятляла. Проста папярэдзіла сваю прыяцельку, дзе мая нянька дапамагала як домработніца».

**«З груднічкамі нянька павінна шмат размаўляць, тады і яны хутчэй загавораць. А з бацькамі — больш слухаць, чым гаварыць. Добрая нянька ніколі не праяўляе ініцыятыву ў зносінах з членамі сям'і».**

Як бачыце, нават рэкамендацыі з «Фэйсбука» не могуць гарантаваць прыстойнасці нянькі. ...На форумах многія мамы пішуць, што ім не падабаецца, што нянька падчас кармлення аблізвае лыжку дзіцяці, есць без дазволу прадукты з халадзільніка. Каб пазбегнуць розных непрыемных сітуацый, у кадравых агенцтвах раяць усталёўваць відэакамеры. Бо калі нянька, напрыклад, возьме з шуфлядкі вашы грошы, будзе вельмі складана даказаць, што яны там былі.

— Я і пад камерамі працавала, — распавядае нянька Галіна Леанідаўна. — Асабіста мяне яны не напружваюць. Калі чалавек сумленны, прыстойны — дык няхай хоць 50 камер паставяць, усё адно да дзіцяці добра ставішся, не крычыш на яго, шкадуеш і корміш — усё, як трэба. Наадварот, калі камера стаіць, ты больш упэўнены ў сабе, што не могуць табе некія прэтэнзіі прад'явіць, незаслужана абвінаваціць.

«Трэцюю няньку я знайшла, калі была на 9-м месяцы, цяжарная Кацяй, — працягвае сваю гісторыю Святлана Зэрэ. — Мы заплацілі 350 долараў агенцтву і з першай спробы знайшлі сваю Ніну. На першым інтэрв'ю зразумелі, што гэта наш чалавек, калі Марыям прашаптала мне на вуха: «Мама, яна мне падабаецца, давай яе возьмем». Ніна вельмі хвалявалася, таму што гэта першая яе работа нянькай. Таму ў першы ж тэставы рабочы дзень у яе нават піражкі прыгарэлі. Але на ўзроўні пачуццяў я разумела, што гэта ўсё дробязі жыцця. Так і выйшла: мы з нашай нянькай ужо амаль чатыры гады, гэта наш член сям'і. Няма нікога, хто б не любіў нашу Ніначку, як называе яе мая Каця.

Што агульнага паміж Нінай і Інай? Узрост 50+, цудоўнае выхаванне і тое, што яны з маленькіх гарадоў. Ніна 30 гадоў працавала медсястрой у бальніцы Бярозы. Што датычыцца даверу, то ў маёй нянькі ёсць ключы ад нашага дома, яна сама лічыць сваю зарплату з першага ж месяца работы. Сама ж яе бярэ ў месцы, дзе ў мяне захоўваюцца грошы на такія выдаткі. Сама аплачвае наяўнымі дастаўку прадуктаў. Я ніколі не правяраю чэкі і ці было штосьці там куплена для яе асабіста. І нават калі раптам хтосьці ў мяне дзесьці штосьці калісьці ўзяў, то гэта не мая карма. Я не збядню ад гэтага. Але я проста ўпэўнена, што мая нянька Ніна, як і Іна, выключна прыстойныя людзі, і ніхто ні разу з іх не даў нагоды сумнявацца. Я пастаянна ўгаворваю Ніну есці маю ежу, але яна прынцыпова носіць ссабойкі. Ніколі не возьме нават клубнічкі з талеркі, калі я не настаю на гэтым.

Я раблю няньцы шчодрыя падарункі, акрамя зарплаты, аплачваю ўрачоў і аналізы, таму што ўдзячна за тое, як яна робіць сваю работу. Калі вы страшна баіцеся даверыць сваіх дзяцей чужой цётцы, то ў вас два выйсці: альбо не давяраць і цягнуць усё на сабе, альбо зрабіць цётку не чужой ці адразу ўзяць «сваю». Інакш гэта трывожнасць будзе вельмі моцна замінаць і вам, і няньцы».

**«Калі ў мяне знікла тысяча долараў, якую я пакінула дома канкрэтна на падарожжа, мы расталіся. Міліцыю я не выклікала, адносінаў не высвятляла».**

* * *

Мне вельмі падабаецца думка сямейнага псіхолага Міхаіла Лабкоўскага пра тое, што дзеці цэняць не колькасць праведзенага з імі часу, а якасць. Паўдня з нянькай і дзве гадзіны са шчаслівай мамай, якая паспела засумаваць, куды лепш, чым суткі са стомленай і раздражнёнай жанчынай. Таму, нават калі ў вас няма магчымасці наняць прафесійную няньку, вельмі карысна час ад часу хоць на пару гадзін дэлегаваць свае абавязкі мужу, бабулі ці сяброўцы, якой давяраеце.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

## Дзе шукаць?

**Заинтересованное лицо:** иностранное унитарное предприятие «Бритиш-Американ Тобакко Трейдинг Компани», зарегистрированное решением Минского городского исполнительного комитета от 2 декабря 1996 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101169738.

**Наименование рекламной игры:** «Выигрывай с glo™!»

**Место (территория) проведения Игры:** Республика Беларусь.

**Срок начала и окончания проведения рекламной игры:** с 5 мая 2022 года по 5 июля 2022 года

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь (Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 4180 от 25.04.2022 года)

**Сведения о количестве участников рекламной игры:** 3 079

**Сведения о розыгрыше призового фонда:** призовой фонд разыгран полностью.

**ФИО победителей Рекламной игры и их выигрыш:**

| № приза | Наименование приза | Кол-во, шт. | Цена, бел.руб. | Победитель |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Смартфон Apple iPhone 12 Pro Китай/маш | 1 | 2 999,17 | Дарья Сергеевна Булдакова |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 448,37 | |
| 2 | Смартфон Apple iPhone 12 Pro Китай/маш | 1 | 2 999,17 | Даниил Дмитриевич Островский |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 448,37 | |
| 3 | Смартфон Apple iPhone 12 Pro Китай/маш | 1 | 2 999,17 | Ольга Владимировна Примшиц |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 448,37 | |
| 4 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Валентин Владимирович Ладыженский |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 5 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Ольга Владимировна Ярзуткина |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 6 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Арина Алексеевна Арабчик |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 7 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Игорь Алексеевич Богданович |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 8 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Людмила Алексеевна Сидорова |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 9 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Ирина Вацлавовна Павлюкевич |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 10 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Вячеслав Владимирович Бартош |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 11 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Степан Андреевич Неезжалый |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 12 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Матвей Андреевич Цыганков |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 13 | Колонка Яндекс Станция Макс Китай/маш | 1 | 520,83 | Светлана Анатольевна Некрашевич |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 61,75 | |
| 14 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Лидия Павловна Курпаченко |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 15 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Никита Русланович Дмитриев |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 16 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Алексей Геннадьевич Сидорович |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 17 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Диана Сергеевна Черепко |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 18 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Виталий Владимирович Соловьёв |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 19 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Сергей Иванович Лой |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 20 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Юлия Владимировна Колб |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 21 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Анжелика Александровна Виняцкая |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 22 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Григорий Владимирович Шалай |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 23 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Владимир Владимирович Карпицкий |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 24 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Ольга Яковлевна Вильгота |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 25 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Александр Иванович Ковальчук |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 26 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Максим Викторович Смирнов |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 27 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Максим Олегович Дятлов |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 28 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Денис Александрович Рогалевич |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 29 | Беспроводные наушники Apple AirPods Китай/маш | 1 | 661,13 | Антон Вячеславович Колочинский |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 83,64 | |
| 30 | Ноутбук Apple MacBook Pro 13 Китай/маш | 1 | 3 775,00 | Максим Витальевич Засуский |
| | Денежная часть приза, которая удерживается Организатором и используются для уплаты за победителя подоходного налога от стоимости приза | | 569,4 | |

**Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: с мобильных телефонов – *7007, со стационарных телефонов – 88011000841**

# Извещение о проведении торгов на право размещения средств рекламы на государственном недвижимом имуществе в г. Гомеле

Торги проводятся 29.07.2022 в 12.00 по адресу: г. Гомель, пр-т Ленина, 3, ком. 501

Организатор торгов – Коммунальное производственное унитарное предприятие «Гомельский городской информационный центр», г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом.1 УНП 400564635, www.gomel.gov.by

| № предмета торгов | Место размещения средства наружной рекламы | Вид средства наружной рекламы | Размер рекламного поля, мм | Площадь рекламного поля, кв. м | Количество рекламных полей, ед. | Общая площадь, кв. м. | Начальная цена предмета торгов, руб. | Размер задатка, руб. | Обязательные условия |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Транспортный проезд, начало (рядом д. 279Б\2 по ул. Барыкина) | Щит односторонний | 1750Х450 | 0,79 | 1 | 0,79 | 25,28 | 25,28 | Без подсветки |
| 2 | Ул. Барыкина – Транспортный проезд, со стороны ул. Войсковая | Пилон односторонний | 2000Х1000 | 2,00 | 1 | 2,00 | 64,00 | 64,00 | Без подсветки |
| 3 | Ул. Барыкина – Транспортный проезд, со стороны ул. Владимирова | Пилон односторонний | 2000Х1000 | 2,00 | 1 | 2,00 | 64,00 | 64,00 | Без подсветки |
| 4 | Ул. Гагарина, 38 | Кронштейн двухсторонний | 900Х1200 | 1,08 | 2 | 2,16 | 69,12 | 69,12 | Без подсветки, вертикальная ориентация |
| 5 | район ул. Владимирова, 6 | Пилон двухсторонний | 960Х400+ 2721Х1700+ 960Х1900 | 6,835 | 2 | 13,67 | 437,44 | 437,44 | Внутренняя подсветка |

Технические требования и условия размещения средств наружной рекламы:

- средства наружной рекламы должны соответствовать требованиям СТБ 1581-2008 «Средства наружной рекламы. Общие технические требования и определения»;
- средства наружной рекламы должны размещаться в соответствии с требованиями к размещению средств наружной рекламы в пределах придорожной полосы (контролируемой зоны) автомобильной дороги, красных линий улиц, дорог или площадей населенных пунктов к постановлению Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395.

Документы на участие в торгах принимаются по 25.07.2022 включительно с 9.00 до 13.00 и с 13.30 до 15.00; в рабочие дни с понедельника по пятницу по адресу: г. Гомель, ул. Красноармейская, 34а, пом. 1, тел. 34-16-67. Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются.

Торги проводятся в форме открытого аукциона на повышение начальной цены в порядке, предусмотренном Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 7 июля 2021 г. № 395.

Задаток в размере начальной цены каждого предмета торгов должен быть внесен не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торогов Государственного предприятия «ГГИЦ» № BY62AKBB30120453053673000000 Гомельское областное управление № 300 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гомель, ул. Фрунзе, 6а, БИК AKBBBY2X, УНП 400564635, получатель – Государственное предприятие «ГГИЦ» (назначение платежа – задаток для участия в аукционе на право размещения средства наружной рекламы по лоту № (указать номер лота).

Лицо, желающее принять участие в торгах, в срок, установленный для приема документов на участие в торгах, обязано заключить с организатором торгов соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения торгов и предоставить организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в торгах установленной формы;
- эскиз средства наружной рекламы в увязке с конкретной архитектурно-планировочной ситуацией по месту его размещения, выполненный на бумажном носителе в цвете;
- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию рекламораспространителя;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка на расчетный счет организатора торгов;
- заверенная копия документа, подтверждающая полномочия руководителя юридического лица.

При подаче документов для участия в торгах и заключении соглашения:

- физическое лицо, в том числе индивидуальный предприниматель, предъявляет организатору документ, удостоверяющий личность;
- представитель физического лица, в том числе индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Оплата права размещения средств наружной рекламы осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется победителем торгов (приравненным к нему лицом) в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Задаток возвращается всем участникам торгов, кроме победителя торгов (лица, приравненного к победителю торгов), в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается, а учитывается при окончательных расчетах.

До проведения торгов с участниками заключается соглашение, в котором предусмотрены права и обязанности сторон в процессе подготовки и проведения торгов, в том числе и размер штрафа, уплачиваемого участником, выигравшим торги, но отказавшимся или уклонившимся от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов, и (или) возмещения затрат на организацию и проведение торгов; участниками, отказавшимися объявить свою цену за предмет аукциона в случае, когда такое объявление предусмотрено законодательством, в результате чего аукцион признан нерезультативным. В соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов», размер штрафа установлен в размере 70 базовых величин за каждый лот аукциона.

Договор на размещение (распространение) наружной рекламы между победителем аукциона (приравненным к нему лицом) и Государственным предприятием «ГГИЦ» заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона, при условии внесения платы за предмет аукциона и возмещения затрат организатору аукциона.

# ИЗМЕНЕНИЕ № 2 В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**«Жилая многоквартирная застройка с объектами общественного назначения на пересечении пр-т Дзержинского и ул. Щорса в г. Минске» (1-я очередь строительства)**

**Застройщик Общество с ограниченной ответственностью «ГрандХаузИнжениринг»** зарегистрировано Минским горисполкомом 28.09.2017 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192975600, вносит следующие изменения в декларацию, опубликованную в газете «Звязда» от 09.04.2021:

**для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан и юридических лиц предлагаются:**

***20 (двадцать) встроенных помещений общественного назначения*** площадью от 30 до 123 кв. м, стоимостью одного кв. м 2100 долларов США с НДС (НДС по ставке 20 %).

Данные помещения размещены на цокольном и первом этаже. Каждый блок встроенных помещений имеет свой санузел. Входы во встроенные помещения первого этажа предусмотрены с уровня открытой галереи, запроектированной вдоль фасада здания. Доступ на галерею со стороны дворовой территории осуществляется с планировочной отметки земли, со стороны главного фасада – по пандусу с уровня земли входов встроенных помещений цокольного этажа.

УНП 192975600.

# ЭХ, ДАРОГІ...

## «Калі не дай бог што, да нас нават пажарная ці «хуткая» не даедзе»

Дакладней, дарога ёсць. Але ўтварылася яна стыхійна. Яе за столькі гадоў наездзілі сваімі машынамі самі жыхары.

— Тое, што вы бачыце зараз, ні ў якае параўнанне не ідзе з тым, што было раней, — кажа Вадзім Лыскавец, які зладзіў улазіны адным з першых. — Першы час проста па полі ездзілі, аб'язджаючы дрэвы і кусты. Уласнымі сіламі ўжо не раз за гэтыя гады падсыпалі сваю палявую дарогу. Дабірацца ж да дома неяк трэба.

— Вось і зусім нядаўна скінуліся і вунь там унізе, дзе пасля дажджоў заўсёды вялізная лужына ўтваралася, выгрузілі больш за 150 тон другаснага бетону, — распавядае **Міхаіл ФОКІН, староста вёскі**, які таксама будуе дом на Маладзёжнай. — Летам яшчэ так-сяк. Але вясной і восенню (паказвае фотаздымкі) мы становімся адрэзанымі ад свету, бо ў дождж альбо адлігу дарогу размывае так, што па ёй зусім не праехаць. Машыны заносіць, што небяспечна для здароўя кіроўцаў і пешаходаў.

— Пасля таго як мы з мужам захраслі ў той бузе і да трох гадзін ночы адкопвалі машыну, — кажа Настасся, — пачалі пакідаць аўто на суседняй вуліцы Вадзіцы. Бралі з сабой боты, пераабуваліся і ішлі дадому. Там такая гразь утвараецца, што становіцца гумовым ботам і — ён там застаецца. Таму дзецям завязвалі пакеты на ногі. Акрамя формы, кніг і пісьмовых прылад, яны яшчэ і боты з сабой насілі ў школу. Смеццявоз таксама захрасаў у нас, некалькі разоў староста нашай вёскі дапамагаў яму выехаць. Цяпер па вясне камунальнікі ад павароту пешкі ходзяць забіраць нашы мяхі са смеццем. А аднойчы наогул не забралі, дык я тэлефанавала па нумары 115, пыталася, чаму. На што мне сказалі: маўляў, да вас жа не дабрацца, у вас дарогі няма. Калі не дай бог што, да нас вясной нават пажарная ці «хуткая» не даедзе...

Вадзім кажа, што, калі атрымліваў участак, бачыў генплан забудовы вуліцы — там была схематычна пазначана не толькі пад'язная дарога, але і тэхнічная аб'язная за дамамі, разваротнае кольца з месцам для смеццевых кантэйнераў. Але дагэтуль нічога не зроблена.

— Несправядлівасць нейкая атрымліваецца. Калі ехаць у бок Гарадзішча праз Ганчароўку, там ёсць поле, дзе таксама нарэзаны ўчасткі, — распавядае яго жонка, якая цяпер знаходзіцца ў дэкрэце. — Дык там дамоў яшчэ няма і падмуркаў нават, але стаяць слупы, зроблена дарога. Чаму ў нас нельга было так зрабіць? Дамы мы ўсе пабудавалі за два гады. Але яшчэ столькі ж чакалі электрычнасць. Дарэчы, правялі нам яе не без дапамогі журналістаў. Таму і цяпер, пасля таго, як напісалі ва ўсе магчымыя інстанцыі, вырашылі звярнуцца ў «Звязду». Бо ўжо проста не ведаем, што рабіць, каб нас пачулі.

Паводле слоў жыхароў вуліцы Маладзёжная, з мінулага года пасля таго, як напісалі калектыўны зварот, да іх па графіку пачаў заязджаць грэйдар.

— Але нам гэтага недастаткова. У канцы мая прайшлі дажджы, — і ў нас зноў дарогі няма, дык я званіла, прасіла, каб нам выдзелілі тэхніку, — кажа Настасся. — На што мне адказалі, што дарогі грэйдуюцца толькі два разы на год, вясной і восенню. Вясной мы ў вас ужо былі...

— Ды і глабальна праблему грэйдар не вырашыць, — кажа староста вёскі. — Летась людзям выдзелілі ўчасткі на нашай вуліцы. Вось зараз пачнуць яны будавацца, паедзе цяжкая тэхніка — і ўзмацніць праблему. Па-добраму, трэба зрабіць нармальную дарогу, з правільным ухілам, каб вада сцякала на ўзбочыну, а не ў цэнтр дарогі, як цяпер.

— І яшчэ непрыемна, што мясцовыя ўлады нас падманваюць, пішуць за подпісам намесніка старшыні райвыканкама, што падсыпалі вуліцу Маладзёжную, — дадае Наталля. — Калі чытаеш такое, дык як быццам

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Так выглядае «маладзёжная дарога» вясной. Фота зроблена мясцовымі жыхарамі.**

аплявуху атрымліваеш. Можа быць, работнікі і далі кіраўніцтву справаздачу, што падсыпалі, мы не ведаем, але насамрэч ніякай падсыпкі не было. Так, грэйдар прайшоў па вясне, а дарогу мы падсыпалі сваімі сіламі. Справядліва ўзнікае пытанне: куды пайшлі грошы, выдзеленыя на дадзеныя работы?..

— Мы ж плацім падатак за дарогі, гэта немаленькая сума, а дарогі наогул няма, — разводзяць рукамі маладыя людзі. — Плюс вуліца Вадзіца, па якой мы дабіраемся дадому, не ў самым лепшым стане, месцамі яма на яме. Таму толькі і паспяваем рамантаваць машыны.

## «Мы нікога ў бядзе не кідаем»

У сваім звароце жыхары вуліцы Маладзёжнай пішуць, што не разумеюць, што адбываецца. «У апошнім адказе Смалявіцкага райвыканкама ад 16 лютага гэтага года нам паведамілі, што пытанне добраўпарадкавання вуліцы Маладзёжнай уключана ў пералік фінансавання на праектаванне, будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў індывідуальнай жылой забудовы на 2022 год. Аднак, калі мы звярнуліся на прамую тэлефонную лінію райвыканкама, нам сказалі, што сёлета ніякіх работ праводзіцца не будзе. У графіку чарговасці планавых работ на 2022 год, які размешчаны на сайце райвыканкама, таксама дадзены від работ адсутнічае».

Калі я заехала ў Забалоцкі сельсавет, яго старшыня **Таццяна КАРНЕЕНКА** паказала мне дакумент, згодна з якім будаўніцтва дарогі па вуліцы Маладзёжнай уключана ў інвестыцыйную праграму на 2022 год. Маўляў, гэтае пытанне было разгледжана на пасяджэнні раённага Савета дэпутатаў, усе прагаласавалі «за». На дадзены момант планы яшчэ не выкананы. Але ж яшчэ толькі пачатак лета...

**Намеснік дырэктара ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Смалявіцкага райвыканкама Мікалай АЛЯХНОВІЧ** пацвердзіў, што вуліца Маладзёжная і два маленькія ўчасткі дарогі прылеглай да яе вуліцы Вадзіца стаяць у планах на праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў раёне. «Будзем праектаваць, з часам будаваць. Дакладных тэрмінаў назваць немагчыма, бо аб'ект толькі пачынае распрацоўвацца. У прыватнасці, на гэты год запланаваныя інжынерныя пошукі, распрацоўка перадпраектнай дакументацыі, адвод зямлі. Магчыма, будзе выбраны па дзяржзакупцы падрадчык на праектаванне. У любым выпадку, ніякага асфальту там не плануецца. Мінімальная інжынерная інфраструктура, якую павінен забяспечыць дзяржаўны забудоўшчык жылых дамоў, — гэта дарогі ў ПГСе (пясчана-гравійная сумесь).

Паводле слоў **намесніка старшыні Смалявіцкага райвыканкама Мікалая ПАРАМОНАВА**, які падпісваў большасць адказаў на звароты вяскоўцаў, у гэтым годзе дарогі на Маладзёжнай не будзе. Калі яна з'явіцца, залежыць ад наяўнасці фінансавых сродкаў.

«Якія і колькі іх будзе ў наступным годзе, я вам зараз не магу сказаць, бо бюджэт наступнага года пакуль не фарміраваўся. Людзі сёння вельмі актыўна хочуць дарогу. Але мы не можам яе зараз зрабіць, бо на ўсё неабходны грошы. Праезд, для таго каб яны маглі трапіць да сваіх зямельных участкаў, мы пакуль ім будзем забяспечваць. Накіроўваем туды грэйдар, каб ён прафіляваў дарогу. Мы нікога ў бядзе не кідаем».

***— А як часта грэйдар можа прыязджаць на адну і тую ж вуліцу?***

— Наогул, згодна з рэгламентам утрымання і абслугоўвання вуліц населеных пунктаў, грэйдзіраванне павінна праводзіцца не менш чым два разы на год. Але калі дарогу размые і праехаць не атрымаецца, мы зразумела, дадаткова адправім тэхніку і забяспечым праезд.

## «Можа б, і зрабілі праект за свае грошы, але дзе якія гарантыі»

Старшыня Забалоцкага сельсавета распавяла, што калі людзі хочуць, каб ім пабудавалі дарогу хутчэй, то яны могуць зрабіць яе праект за свае грошы. «У красавіку мінулага года я разам з прадстаўнікамі КУП «Смалявіцкая ЖКГ» і ДП «УКБ Смалявіцкага раёна» сустракалася з жыхарамі вуліцы Маладзёжная. Ім прапанавалі паўдзельнічаць у долевым фінансаванні работ па будаўніцтве дарогі. Аднак гэту прапанову вяскоўцы не падтрымалі».

«Яны ж не гарантуюць, што, калі мы зробім праект, у нас у наступным годзе з'явіцца дарога, — каментуе Вадзім Лыскавец. — Сказалі: калі будзе фінансаванне, тады мы, МАГЧЫМА, вас уключым у план. Калі б нам далі нейкія канкрэтныя пісьмовыя гарантыі, мы, можа, і рабілі б штосьці. А выкласці такія вялікія сумы на праект дарогі, якая невядома калі будзе зроблена, наўрад ці хто на гэта пойдзе».

— Калі пачыналі пісаць, ва ўсіх была надзея, — кажа Наталля. — Мы ж звяртаемся да органаў выканаўчай улады. Ну хто, як не яны, дапамогуць? Мы ж тут і так іх не турбавалі, за свае грошы правялі сабе водаправод і газ...

Падчас размовы з намеснікам старшыні Смалявіцкага райвыканкама я спыталася пра гарантыі датычна долевага будаўніцтва дарог. «Практыка дзяржаўна-прыватнага партнёрства ёсць у раёне, — адказаў Мікалай Парамонаў. — Некаторыя вяскоўцы фарміруюць кааператывы і, для таго, каб дарога з'явілася хутчэй, робяць яе праект за свае грошы». — «Жыхары вуліцы Маладзёжнай перажываюць, што яны ўкладуць грошы ў праект, а ім усё адно доўга прыйдзецца чакаць...» — «Калі грамадзяне ўдзельнічаюць у суфінансаванні, то, зразумела, мы будзем шукаць магчымасць, каб хутчэй гэта зрабіць. Мы нясём адказнасць за свае прапановы».

Паводле слоў **начальніка аддзела ўтрымання дарожнай сеткі і бяспекі дарожнага руху КУП «Мінскаблдарбуд» Валянціна ВОЎЧАНКІ**, «дарогі ў так званых раёнах індывідуальнай забудовы не знаходзяцца на балансе «Мінскаблдарбуда», але відавочна, што калі ўчастак афіцыйна куплены на аўкцыёне ці выдзелены райвыканкамам людзям, якія мелі патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то мясцовыя ўлады павінны забяспечыць да яго нейкія пад'язныя шляхі. Гэта само сабой разумеецца. А як па-іншаму? Чалавек жа не проста так зайшоў у лес і пабудаваў там сабе дом».

Мікалай Парамонаў, адказваючы на маё пытанне, чаму пад'язную дарогу не пабудавалі перад тым, як выдзяляць людзям участкі, сказаў: «Я не магу адказаць, як ім іх тады (у 2013 годзе) выдзялялі. Зараз мы фарміруем зямельныя ўчасткі, каб мінімальная інжынерная інфраструктура была адразу».

— Што вы маеце на ўвазе пад мінімальнай інфраструктурай? — удакладняю.

— Дарога (гравійная ці грунтавая), электразабеспячэнне.

Па дарозе ў сельсавет жыхары вуліцы Маладзёжнай паказалі мне асфальтаваную дарогу, якая летась з'явілася на месцы гравійкі. «Людзі таксама па вясне не маглі да электрычкі дабрацца, бо ў сезон яе моцна размывала, шмат гадоў пісалі звароты, і, як бачыце, знайшлося фінансаванне. Яны ж дабіліся, каб ім зрабілі дарогу, можа быць, і ў нас што-небудзь атрымаецца...» Я таксама чула ад вясковых жыхароў нямала гісторый, звязаных з дарогамі. У большасці сітуацый пасля зваротаў не адразу, але пытанні пастунова вырашаліся. Ды што далёка хадзіць! Калі мы пераехалі жыць у вёску, два кіламетры гравійнай дарогі былі аскомінай на шляху да дома. Мясцовыя жыхары таксама шмат гадоў пісалі звароты, звярталіся да мясцовай улады з просьбай пакласці асфальт. Але чыноўнікі марудзілі, а воз ніяк не кранаўся з месца. Казалі, што ў раёне шмат дарог, якія патрабуюць тэрміновага рамонту. Што асфальт з нуля — гэта вельмі дарагое задавальненне. Урэшце ў райвыканкаме прапанавалі вяскоўцам зрабіць свой унёсак у агульную справу і падзяліць выдаткі з дзяржавай. Прыблізны кошт праекта будаўніцтва дарогі, у выніку мы павінны былі здаць па 200 рублёў з хаты. Пры гэтым што толькі ні казалі мясцовыя ўлады: у прыватнасці, збірайце грошы, на працягу трох гадоў пакладзём асфальт. Які быў сюрпрыз, калі старшыня аблвыканкама, даведаўшыся аб праблеме, даручыў КУП «Мінаблдарбуд» заасфальтаваць участак дарогі за кошт бюджэтных сродкаў. Грошы ж, якія мы збіралі на дарогу, нам вярнулі. І менш чым за паўгода ў нас з'явіўся асфальт.

Застаецца пажадаць жыхарам вуліцы Маладзёжнай, каб у іх таксама як мага хутчэй з'явілася доўгачаканая дарога. А таксама, што немалаважна, узаемаразуменне з мясцовымі ўладамі. Бо пакуль, чула на ўласныя вушы, плённая камунікацыя не атрымліваецца. А крыўды і непаразуменні растуць. Дарэчы, падчас камандзіровак заўважыла такую тэндэнцыю, што некаторыя (дзякуй богу, не ўсе) прадстаўнікі мясцовай улады абмяжоўваюцца афіцыйнымі адказамі на звароты і ў лепшым выпадку адзінкавымі выездамі на месца. А гэтага, як паказвае жыццё, не заўсёды дастаткова. З людзьмі важна размаўляць, выслухоўваць іх, цярпліва тлумачыць, калі нешта не зразумела, калі трэба — і па некалькі разоў. І напрыканцы яшчэ адзін маленькі штрых: падчас падрыхтоўкі гэтага матэрыялу два прадстаўнікі мясцовай улады задалі мне адно і тое ж пытанне: маўляў, вы ж былі на вуліцы Маладзёжнай, і няўжо вы лічыце, што там цяпер няма магчымасці пад'ехаць да дамоў? Калі ж я згадала вясновыя фотаздымкі размытай дарогі — адна рэакцыя, шчыра прызнацца, здзівіла: маўляў, трэба ацэньваць сітуацыю, якая ёсць на дадзены момант.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Шаноўныя чытачы, калі і ў вас ёсць пытанні, якія хвалююць, пішыце! Паспрабуем разабрацца ў праблемнай сітуацыі разам. Наш паштовы адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а; электронны адрас для зваротаў — zvarot@zviazda.by.**




*(У 1933 годзе Янка Купала пабываў на Палессі, дзе вялі асушэнне балот. Пад уражаннем убачанага ён напісаў паэму «Над ракой Арэсай».)*

Фота слова

*Сонечным летнім ранкам*
*не ўбачым Вас на ўзлеску...*
*Як Вы там, дзядзька Янка,*
*ці помніце пра Арэсу?*
*Вам, у нябесных аблоках*
*суджана апынуцца...*
*Арэса чакала Вас доўга -*
*Вы ёй абяцалі вярнуцца.*
*Вы верылі: ў хмарнай навале*
*сузор'е Надзеі свеціць,*
*Ды зорка паэта ўпала*
*ў бездань маўклівых лесвіц.*
*Былое дажджамі змые,*
*новая рунь юнае...*
*Часіны ўжо не тыя.*
*Арэса ўжо не тая.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.41 | 21.45 | 17.04 |
| Віцебск — | 4.22 | 21.43 | 17.21 |
| Магілёў — | 4.31 | 21.35 | 17.04 |
| Гомель — | 4.37 | 21.22 | 16.45 |
| Гродна — | 4.58 | 21.58 | 17.00 |
| Брэст — | 5.08 | 21.50 | 16.42 |

## Месяц

***Маладзік 29 чэрвеня. Месяц у сузор'і Блізнят.***

## Імяніны

***Пр.*** *Мануіла, Савацiя, Савелія.* ***К.*** *Гертруды, Люцыны, Эміліі, Арнольда, Кірылы, Раймунда, Уладзіслава, Эрнеста.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Ну і ну!

## КРАДЗЕЖ З ПЕРААПРАНАННЕМ

**У апаратыўна-дзяжурную службу Ленінскага РУУС Магілёва з заявай звярнулася 29-гадовая жыхарка горада, якая расказала, што ў яе былў выкрадзены заплечнік з маёмасцю на агульную суму больш за 300 рублёў. Інцыдэнт адбыўся каля трох гадзін раніцы паблізу аднаго з бараў. Унутры заплечніка знаходзіўся кашалёк з наяўнымі, пашпарт дзяўчыны, навушнікі і сярэбраныя завушніцы.**

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку высветлілі, што чужую маёмасць забрала раней не судзімая 64-гадовая магіляўчанка. Высветлілася, што пенсіянерка ў начны час пераапраналася ва ўніформу дворніка: жанчына здабыла для сябе сігнальную аранжавую камізэльку, у рукі брала ўборачны інвентар. Пасля трох ночы яна спецыяльна прагульвалася каля ўваходаў у начныя ўстановы, да прыходу рэальных работнікаў ЖЭУ правяраючы, ці не пакінуў хто сваю маёмасць без нагляду. Пенсіянерка звярнула ўвагу на заплечнік, які стаяў на лаўцы. Праходзячы, яна неўзаметку забрала яго з сабой, а пасля спешна сышла.

Удалося дазнацца, што і ўладальніца маёмасці, і кампанія, у якой заяўніца адпачывала, адзылі ад заплечніка літаральна на некалькі метраў, размаўляючы і не заўважаючы жанчыну, якая праходзіць міма. Апошняя ж выкінула заплечнік каля свайго дома, а маёмасць і грошы забрала сабе.

Цяпер выкрадзенае часткова канфіскавана. У дачыненні да магіляўчанкі заведзена крымінальная справа, следчымі дадзена прававая ацэнка.

## АБАКРАЎ РОДНУЮ МАЦІ

**У дзяжурную часць Баранавіцкага ГАУС звярнулася 79-гадовая мясцовая жыхарка, якая патлумачыла, што невядомая асоба выкрала з яе кватэры 14 000 долараў.**

На месца неадкладна выбылі супрацоўнікі крымінальнага вышуку райаддзела, якія пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў устанавілі асобу падазронага: ім аказаўся 58-гадовы сын пацярпелай, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Брэсцкага аблвыканкама.

Як аказалася, мужчына перыядычна наведваў маці і ведаў, што ў яе ёсць буйная грашовая сума. Так, у адзін з дзён падазраваны выкраў грошы ў надзеі, што жанчына не заўважыць згубы, аднак падчас чарговай прыборкі дома пенсіянерка выявіла адсутнасць назапашанага і звярнулася па тэлефоне 102.

Падчас агляду месца жыхарства сына прававахоўнікі знайшлі выкрадзенае.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Даты | Падзеі | Людзі

### 30 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

**1862** год — выдадзены 1-ы нумар газеты «Мужыцкая праўда» — першай нелегальнай рэвалюцыйна-дэмакратычнай газеты на беларускай мове (выдавалася К. Каліноўскім, Ф. Ражанскім і В. Урублеўскім да ліпеня 1963 года.

**1898** год — у Віцебску пушчаны першы ў Беларусі трамвай.

**1922** год — нарадзіўся (в. Дуброўка Добрушскага раёна) Міхаіл Фёдаравіч Талкачоў, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1941 года на розных франтах. Удзельнік баёў у Цвярской вобласці, на тэрыторыі Літвы, Польшчы, Германіі. Батарэя асобнага знішчальнага супрацьтанкавага дывізіёна пад камандаваннем Талкачова вызначылася 22 красавіка 1945 г. у баях на падступах да Берліна: падраздзяленне прасунулася ў тыл ворага, перарэзаўшы шашу, не дазволіла рэзервам праціўніка прарвацца да Берліна. Удзельнік штурму рэйхстага, Парада Перамогі ў Маскве.

**1927** год — нарадзіўся (г. Бабруйск) Уладзімір Міхайлавіч Міхалкін, савецкі военачальнік, маршал артылерыі (1989). У Вялікую Айчынную вайну быў шафёрам, тэлефаністам. Пасля вайны камандаваў артылерыйскімі падраздзяленнямі, камандзір артылерыйскага палка, дывізіі. З 1974 года — начальнік ракетных войскаў і артылерыі танкавай арміі БВА. З 1979 года — начальнік штаба — намеснік камандуючага, з 1982-га — першы намеснік камандуючага, затым камандуючы ракетнымі войскамі і артылерыяй Сухапутных войск СССР.

**1957** год — у Мінску пад дэвізам «Праца, мір, дружба!» адбыўся 1-ы Усебеларускі фестываль моладзі. Працягнуўся да 2 ліпеня. У фестывалі ўдзельнічала 20 тысяч юнакоў і дзяўчат, у тым ліку госці з іншых савецкіх рэспублік і Польшчы. У час фестывалю прайшлі сустрэчы моладзі з ветэранамі партыі, Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, вучонымі і пісьменнікамі, а таксама розныя конкурсы.

**1942** год — на Магілёўшчыне пачалася першая карная аперацыя гітлераўцаў супраць партызан і мірных жыхароў Клічаўскай партызанскай зоны пад кодавай назвай «Майскі жук» (яе працягам стала аперацыя «Арол»). Спроба акружыць і знішчыць партызанскія фарміраванні поспеху не мела.

У свеце

**1894** год — у цэнтры Лондана над ракой Тэмзай, недалёка ад Лонданскага Таўэра, адкрыты Таўэрскі мост.



Часам блытаюць з Лонданскім мостам, размешчаным прыкладна ў 0,8 км вышэй па цячэнні. Будаўніцтва пачалося ў 1886 годзе; адкрыты ў 1894 годзе. Таксама з'яўляецца адным з сімвалаў Лондана і Брытаніі.

**1908** год — над цэнтральнай часткай Сібіры, у міжрэччы Ніжняй Тунгускі і Лены, праляцеў, а затым узарваўся гіганцкі шар, названы Тунгускім метэарытам.

**1934** год — нарадзілася Іна Ульянава, савецкая і расійская актрыса тэатра і кіно, выканаўца камічных і характарных роляў. Знялася ў фільмах «Сямнаццаць імгненняў вясны», «Пакроўскія вароты», «Бархатны сезон», «Не хадзіце, дзеўкі, замуж» і іншых.

**1956** год — у савецкіх газетах апублікавана пастанова ЦК КПСС «Аб пераадоленні культу асобы і яго наступстваў».

Так гаварыў...

**ЖАН МАЛЬЕР:**

*«Той, хто хоча абвінаваціць, не мае права спяшацца».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Колькі гадоў жыву і ўсё не магу зразумець: адкуль бярэцца пыл і куды дзяваюцца грошы?**

Калі я буду самім сабой, дык людзі вельмі хутка пацягнуцца да стрэльбы.

**— Прачынайся!**

**— Ну, яшчэ дзесяць гадзінак...**

**— Можа, хвілінак?**

**— Не.**

Дача грошай у доўг трэніруе памяць...




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1509.

Нумар падпісаны ў 19.30 29 чэрвеня 2022 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12